№ 7 (557) 21 лютага 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА
ISSN 1819-1614
Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Нацыя з прабіркі

Эўрасаюз і ЗША расьсеклі гордзіеў вузел Балканаў і сталі хроснымі бацькамі незалежнага Косава. Старонка 4.

## У НУМАРЫ

**Непразрысты продаж Velcom'у — дзяржаўная палітыка**

«На момант продажу апэратара мы вялі перамовы з Расеяй наконт цэнаў на газ, змагаліся за кожны даляр», — старшыня Дзяржкамітэту па маёмасьці Георгі Кузьняцоў. **Старонка 9.**

**Згасаньне актыўнасьці**

На акцыю пратэсту дробных прадпрымальнікаў прыйшлі пару соцень маніфэстантаў. **Старонка 10.**

**Скажы мне, што ты распаўсюджваеш...**

Я зьвярнуўся ў Адміністрацыю прэзыдэнта з пытаньнем, чаму ў нас распаўсюджваецца чарнасоценная газэта «Русский вестник», а нацыянальныя дэмакратычныя выданьні забароненыя для распаўсюджваньня. З «Пошты рэдакцыі» — **старонка 18.**



**Энцыкляпэдыя**

Новы праект Капітана Танакі. **Старонка 30.**

## Пра Казуліна, ягоную жонку і Эўрасаюз



«Ён **[Казулін]** адмовіўся **[выйсьці на свабоду пры ўмове эміграцыі ў Нямеччыну]** нават пасьля таго, як ягоныя дочкі паехалі і ўгаворвалі ўратаваць маму, яму гэтая мама ўжо даўно не была трэба...» — сказаў А.Лукашэнка ў Віцебску. Ці выйдзе на волю перадапошні палітвязень? **Старонка 3.**

**На фота —** дыялёг на практыцы: дачка Казуліна Вольга і амонаўцы падчас мітынгу прадпрымальнікаў.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Нашаніўцы ў Менску і Горадні

Увага! Прэзэнтацыя кнігі **Евы Вежнавец «Шлях дробнай сволачы»** перанеслася: яна пройдзе **22 лютага ў Менску на Ўправе БНФ (вул..Машэрава, 8)**. **Пачатак а 18-й.**

**29 лютага ў 18.30 у Горадні на сядзібе ТБШ (вул,Будзёнага, 48а)** адбудзецца вечарына дзіцячай кнігі. Удзел возьмуць перакладчык на беларускую мову кніжкі А.Мілна «Віня-Пых» Віталь Воранаў і рэдактар перакладу кнігі А.Ліндгрэн «Карлсан-з-даху» Лявон Баршчэўскі. На вечарыне таксама можна будзе пазнаёміцца з сьвежымі выданьнямі «Arche» і «Кнігарні «Наша Ніва».

Франак Вячорка пасьля выхаду з Акрэсьціна.



WWW.SVABODA.ORG

## Франака Вячорку адлічылі з БДУ

15 лютага з трэцяга курсу журналісцкага факультэту БДУ быў адлічаны старшыня культурніцкай камісіі Партыі БНФ Франак Вячорка. Афіцыйная прычына — «акадэмічная непасьпяховасьць».

Напярэдадні акцыі прадпрымальнікаў 21 студзеня Ф.Вячорку затрымалі ля Цэнтральнага РУУС Менску, куды прыходзіў падтрымаць паплечнікаў. Франака асудзілі на 15 сутак. За гэты час ён прапусьціў два іспыты ў ВНУ.

«У пятніцу дэкан Дубавік паведаміў, што загадам прарэктара я адлічаны за «акадэмічную непасьпяховасьць». Калі я запытаў, як так атрымалася, ён пацiснуў плячыма: «Ну вось так атрымалася». Я зразумеў, што рашэньне аб маім адлічэньні прымаў ня ён. Я зьвязваю адлічэньне зь нядаўнім прыездам на журфак Лукашэнкі. Ён заявіў пра новае бачаньне журналістыкі і працы факультэту, я ў тое бачаньне не ўпісаўся. Зьбіраюся падаваць у суд аб незаконным рашэньні прарэктара. Буду ініцыяваць студэнцкія акцыі салідарнасьці. Трэба задумацца і пра далейшы лёс, дзе і як працягнуць вучобу. У іншым выпадку, магу пайсьці ў войска, як Жалезьнічэнка. Магчымасьць вучыцца за мяжой разглядаю ў апошнюю чаргу», — кажа Ф.Вячорка.

Франак ня першы студэнт, якога адлічылі сёлета за арышты. Напрыклад, з ін'язу выгналі Антона Каліноўскага і Ганну Мядзьведзеву, а з Акадэміі фізвыхаваньня — Тацяну Цішкевіч.

**Зьміцер Панкавец**

### Швэцыя спыняе супрацу з журфакам БДУ

Прыпыніць кантакты было вырашана, калі з вучобы за грамадзка–палітычную дзейнасьць адлічылі Франака Вячорку. Швэдзкія партнэры уклалі ў стажыроўкі і падвышэньне кваліфікацыі выкладчыцкага складу 49 млн крон (каля 7 млн даляраў).

**КАМЭНТАР**

## Намэнклятура пачала азірацца на «Вашынгтонскі абкам»?

Рутынная прэзэнтацыя новых-старых кадраў — сп.Міклашэвіча і Васілевіча раптам ператварылася ў даволі рэзкі выступ прэзыдэнта на тэму небясьпечных падводных плыняў у намэнклятуры.

Спачатку А.Лукашэнка падкрэсьліў, што ніякай надзвычайшчыны ці пэрсанальных прэтэнзіяў за гэтай ракіроўкай шукаць ня варта. Маўляў, звычайная ратацыя. Але потым тон зьмяніўся. Высьветлілася: у асобных дзеячаў зашмат амбіцый, «хто-ніхто ў судах, пракуроры заняліся палітыкай», «іх хвалюе, як на нас паглядзяць Амэрыка ды Эўрасаюз». Трапіла на арэхі і неназваным пэрсонам з найбліжэйшага атачэньня. Маўляў, зашмат на сябе бяруць: «Папярэджваю Адміністрацыю прэзыдэнта: ніякага ціску на найвышэйшыя органы дзяржаўнай улады быць ня мусіць».

«Лукашэнка заўжды з падазрэньнем ставіўся да свайго атачэньня, і гэта не аднойчы выходзіла на публіку», — зазначае палітоляг Валер Карбалевіч. Так, не далей як летась суровы «разбор палётаў» спасьціг вярхоўку КДБ. Дый вызваленьне Міклашэвіча ад пасады генпракурора выглядала спантанным, імпульсіўным рашэньнем. З раніцы ён зрабіў справаздачу кіраўніку дзяржавы, атрымаў даручэньні і распавёў, што гатовы іх выканаць перад тэлекамэрамі… А ўвечары як сьнег на галаву — указ. Цяпер во высьвятляецца, што ў прэзыдэнта ёсьць прэтэнзіі да кадраў пракуратуры.

Бадай, невыпадкова Лукашэнка згадаў у выступе 19 лютага пра аглядку часткі чынавенства на Захад. Усё ж фігураваць у розных чорных сьпісах, асабліва калі беларускі эканамічны цуд пакрысе зьдзімаецца і сам кіраўнік робіць пэўныя саступкі Эўропе ды Вашынгтону, — асабліва некамфортна. Магчыма, у высокіх эшалёнах сапраўды абмалявалася нейкая умоўна (ну вельмі умоўна! :) лібэральная групоўка?

«Калі на даляглядзе зьяўляюцца сур'ёзныя цяжкасьці, разброд у вэртыкалі ўзмацняецца, — зазначае Карбалевіч. — Лукашэнка як чуйны палітык гэта разумее».

На думку аналітыка, сёньня наўрад ці выпадае казаць пра нейкую змову ў атачэньні, але ў выпадку крызы яна ня выключаная: «У намэнклятурнай дзяржаве небясьпека для першай асобы зыходзіць найперш з асяродзьдзя намэнклятуры, з магутных сілавых структураў. І таму прэзыдэнт пэрыядычна ладзіць своеасаблівую прафіляктыку».

**Аляксандар Класкоўскі**

### Першы том «Вялікага гістарычнага атлясу Беларусі»

Усяго мае выйсьці тры тамы выданьня, паведаміў старшыня Дзяржкамітэту па маёмасьці Георгі Кузьняцоў. Першы том ахоплівае пэрыяд ад каменнага веку да 1300 г., другі — ад 1300 г. — да 1917 г., і апошні — ад 1917 г. — да нашых дзён. Зь ягоных словаў, у працы бяруць удзел гісторыкі, што маюць розныя погляды і падыходы да вывучэньня айчыннай гісторыі.

**СП**

# Пра Казуліна, ягоную жонку і Эўрасаюз. Дaслоўна



«Ён [Казулін] адмовіўся [выйсьці на свабоду пры ўмове эміграцыі ў Нямеччыну] нават пасьля таго, як ягоныя дочкі паехалі і ўгаворвалі ўратаваць маму, яму гэтая мама ўжо даўно не была трэба...» — сказаў Лукашэнка.

Пытаньне «так званых палітвязьняў» у Беларусі закрыта. Пра гэта заявіў у Віцебску А.Лукашэнка ў адказ на пытаньне журналістаў. Фраза была сфармуляваная закавырыста: «Я думаю, што тое, як ставіць пытаньне Эўрасаюз перад намі, — ня варта выедзенага яйка, і таму мною было прынятае рашэньне вызваліць тых людзей, за якіх так прасіў Захад і ЗША». Далей кіраўнік дзяржавы патлумачыў, чаму, на ягоную думку, Захад так стаяў за вызваленьне палітвязьняў: «Яны, відаць, рабілі добрыя справы для ЭС і ЗША, і тыя цяпер іх у бядзе ня кідаюць». І ўрэшце зрабіў камплімэнт: «Гэта адзінае, што мне падабаецца ў пазыцыі ЭС і ЗША».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Ён працягваў эківокамі: «Наколькі я інфармаваны, гэтая пазыцыя не задаволіла аднаго Казуліна. Пытаньне было ў тым, што ягоная жонка хворая, і да мяне зьвярнуліся паслы Эўрасаюзу... Я згадзіўся — хай вязе, лякуе жонку. Сёньня стаіць пытаньне пра лекаваньне ў Нямеччыне, трэба суправаджаць жонку... Але наколькі ранкам я быў інфармаваны, ён адмовіўся яе лекаваць. Але гэта сямейныя праблемы, адмовіўся, дык адмовіўся. Што трэба ад мяне, я прапанаваў, але ён адмовіўся яе лекаваць. Ён адмовіўся нават пасьля таго, як ягоныя дочкі паехалі і ўгаворвалі ўратаваць маму, яму гэтая мама ўжо даўно не была трэба... Але я не хачу ўлазіць у чужыя дзялы, жыцьцё ўсе расставіць па сваіх месцах».

«Граць на душах і пачуцьцях іншых людзей проста непрыгожа. Няхай лепш сходзіць у царкву і памоліцца. Ня трэба прыкрывацца хваробай маёй маці», — пракамэнтавала выказваньні А.Лукашэнкі дачка Аляксандра Казуліна Вольга.

## Вольга Казуліна: Ня трэба прыкрывацца хваробай маёй маці.

Сама Ірына Казуліна гаварыць ня можа, праз хваробу ў яе зьнік голас. Але яна разьмясьціла заяву на сайце www.kozylin.com:

«Першае. Зачапіла за жывое грэблівае стаўленьне да нашай сям'і, — адзначае спадарыня Казуліна. — Хоць часам здаецца, што нічога падобнага ўжо не можа вывесьці зь сябе, цынізм дзівіць. У сваіх лістах мой муж піша, што самы вялікі яго боль і клопат — гэта я. Кожную раніцу ён пачынае з малітвы за маё здароўе.

Другое. Хацелася б пачуць умовы, на якіх Лукашэнка прапаноўваў Аляксандру вызваленьне. Тыя прапановы, якія былі агучаныя яго пасланцом нам, былі непрымальнымі. Гэта было б ганебнымі ўцёкамі з краіны.

Трэцяе. Дзеці езьдзілі на спатканьне ня ўмольваць бацьку ратаваць маму, а абгаварыць бягучую сытуацыю.

Чацвёртае. Мы зь дзецьмі і ўсе нашы блізкія разумеем Аляксандра, падтрымліваем яго, любім і чакаем яго безумоўнага вызваленьня».

Віцебскую рэпліку аб праблеме палітвязьняў А.Лукашэнка скончыў апэляцыяй да народу: «Мы зрабілі беспрэцэдэнтны крок добрай волі і цяпер паглядзім, як адкажуць на гэта ЭС і ЗША. — Нашаму народу я раю паназіраць за рэакцыяй Захаду: наколькі яны гатовыя да канкрэтных крокаў».

«Словы А.Лукашэнкі ня ёсьць словамі моцнага палітыка, а чалавека загнанага ў кут, які мусіць агрызацца, — гэтак камэнтуе пятнічныя заявы былы палітвязень Зьміцер Дашкевіч, які выйшаў на волю 25 студзеня. — Аляксандар Казулін чарговы раз засьведчыў сваю нязломнасьць і мужнасьць. Ягоная стойкасьць вартая павагі і шанаваньня».

**МБ, ЗП**

### Выпусьцілі Андрэя Клімава

15 лютага на волю выйшаў Андрэй Клімаў. Ён быў вызвалены ў адпаведнасьці з прэзыдэнцкім указам аб памілаваньні, пра якое, паводле ягоных словаў, не прасіў. Клімава пад канвоем даставілі на вакзал Мазыру і ўжо 16 лютага раніцай ён быў у Менску. Нагадаем, 1 жніўня суд даў Клімаву два гады калёніі строгага рэжыму за публікацыю на сайце ucpb.org. У дзень вызваленьня, калі яму загадалі «зьбірацца з рэчамі», аднакамэрнікі адразу сказалі: «Пэўна, пойдзеш за сваімі карашамі на волю».

### Затрыманае кіраўніцтва «Маладога фронту»

У нядзелю сябры Цэнтральнай Рады незарэгістраванага «Маладога фронту» сабраліся на паседжаньне ў в.Заямачнае пад Менскам, у прыватным доме. Рада доўжылася ўсяго хвілінаў дваццаць. Пасьля ў дом уламіўся спэцназ. Кіраваў апэрацыяй намесьнік кіраўніка РУУС Менскага раёну маёр Міхаіл Крыж. Міліцыянты патрабавалі дакумэнты, а потым, паводле словаў А.Фінькевіча, спрабавалі гвалтам выводзіць дзяўчат. Хлопцы заступіліся, завязалася кароткая бойка. Урэшце ўсе маладафронтаўцы, агулам 31 чалавек, былі затрыманыя. Іх адвезьлі ў РУУС Менскага раёну, дзе дапытвалі. Да 21.05 усіх выпусьцілі. Позваў у суд не выпісвалі.

# Нацыя з прабіркі

Эўрасаюз і ЗША расьсеклі гордзіеў вузел Балканаў і сталі хроснымі бацькамі незалежнага Косава. Піша **Мікола Бугай.**

Гэтай дзяржавы не было б, каб не Югаславія. Гэта значыць, каб сэрбскі шавінізм, апрануты ў югаславянскія шаты, не правёў адвольна межы пасьля падзелу Асманскай імпэрыі. Гэтай дзяржавы не было б, каб ня НАТО (чытай — ЗША), якое сілай вывела гэтую тэрыторыю з-пад кантролю Бялграду. Гэтай дзяржавы не было б, і каб ня родная для касавараў альбанская мова.

Гісторыяй паўстаньня Косава можна ілюстраваць клясычную тэорыю нацыятварэньня. Гісторыя заканамернасьцяў і парадоксаў, вялікадзяржаўных амбіцыяў і этнічнага «я», якое не прыдушыць. А таксама гісторыю апекі: гэта праўда, што Эўропа і Амэрыка з этнічнай групы, якую яднала толькі мова і нянавісьць да «старшага брата», узгадоўваюць дзяржаўніцкую нацыю.

## Нараджэньне дзяржавы

Парлямэнт Косава, які сабраўся ў нядзелю на экстранае паседжаньне, у другой палове дня адзінагалосна — 109 чалавек — прагаласаваў за абвяшчэньне незалежнасьці краю ад Сэрбіі. Дэлегаты ад сэрбскіх раёнаў не галасавалі.

«Мы вельмі доўга чакалі гэтага дня», — заявіў прэм'ер-міністар Косава, былы партызанскі камандзір Хашым Тачы, перш, чым зачытваць тэкст дэкляарацыі пра незалежнасьць краю, насельніцтва якога складае 2 мільёны чалавек. Тачы заявіў, што Косава будзе імкнуцца стаць дзяржавай для ўсіх народаў, якія насяляюць край. Сэрбская меншасьць ня верыць у шчырасьць гэтых заяваў. Гісторыя дачыненьняў славянаў ды ілірыйцаў у Косаве далёкая ад ідыліі.

На вечаровай прэс-канфэрэнцыі Тачы і прэзыдэнт Фатмір Сэйдзіў заявілі, што будуць імкнуцца да прыязных стасункаў з усімі суседзямі. Тачы і Сэйдзіў заявілі, што мэта новай дзяржавы — эўраінтэграцыя, у тым ліку і ўваходжаньне ў НАТО.

У нядзелю таксама была зацьверджаная даволі безаблічная новая сымболіка незалежнай краіны — да гэтага выкарыстоўваўся альбанскі чырвоны сьцяг з арлом. Сьцягам суверэннага Косава стаў сіні штандар з жоўтым абрысам дзяржавы пасярэдзіне. Над абрысам — шэсьць зорак белага колеру, якія сымбалізуюць колькасьць этнічных групаў, што насяляюць Косава — альбанцы, сэрбы, цыганы, басьнійцы, туркі і ашкалі.

Увечары ў сталіцы новай краіны пачаўся сьвяточны канцэрт і народныя гуляньні.

## Прызнаньні і непрызнаньні

Першымі незалежнасьць Косава прызнаў Аўганістан, а даверчыя лісты ў Прыштіне першым уручыў пасол Турцыі. ЗША і некаторыя краіны Эўрасаюзу, у тым ліку Брытанія, Францыя, Нямеччына й Італія, ужо ў панядзелак заявілі, што прызнаюць Косава. Асабліва пасьлядоўна падтрымлівалі незалежніцкія памкненьні Косава амэрыканцы — маніфэстанты ў Прыштіне разам з нацыянальнымі штандарамі ў дзень абвяшчэньня незалежнасьці масава размахвалі зоркава-паласатымі.

Аднак прынамсі пяць чальцоў Эўрасаюзу — Кіпр, Грэцыя, Славаччына, Гішпанія й Румынія (апошняя — нягледзячы на дыпляматычны ціск Парыжу) — далі зразумець, што ня будуць адразу прызнаваць новай дзяржавы. Урады гэтых краінаў баяцца, што факт незалежнасьці Косава актывізуе сэпаратысцкія рухі ў іх дома.

Пра сваё жаданьне прызнаць незалежнасьць абвясьціла Літва, якая сама нядаўна знаходзілася ў стане «самаабвешчанай незалежнасьці». У той жа час уплывовая польская «Газэта Выборча» вуснамі свайго камэнтатара напісала, што гэтымі днямі «Сэрбія патрабуе маральнае падтрымкі».

Сэрбія катэгарычна супраць незалежнасьці Косава, яна па-ранейшаму лічыць край сваёй правінцыяй. Праваслаўны япіскап Косава Арцемі заклікаў сэрбаў прывезьці на дапамогу расейскіх добраахвотнікаў і са зброяй у руках бараніць «калыску сэрбскае айчыны».

Прэзыдэнт Сэрбіі Барыс Тадзіч заявіў, што ягоная краіна «ніколі не прызнае назаконнай незалежнасьці Косава». Таксама ён сказаў, што Бялград мае права ўжыць эканамічныя і палітычныя санкцыі, аднак выключае ваеннае ўмяшальніцтва. «Хопіць, Сэрбія ўжо наваявалася», — неаднаразова заяўляў Тадзіч падчас сваёй прэзыдэнцкай кампаніі.

## Міжнароднае права

Выпадак Косава чарговы раз агаліў унутраную супярэчнасьць у Хартыі ААН, дзе ў першым артыкуле гаворыцца пра самавызначэньне нацыяў, а ў другім пра непарушнасьць межаў. Гэта дазваляе інтэрпрэтацыю з пазыцыі нацыянальных інтарэсаў тае ці іншае краіны.

Вось Турцыя. Турэцкі пасол першы ўручыў у Прыштіне свае даверчыя лісты. Анкара адзіная на сьвеце краіна, што прызнае сэпаратысцкую Турэцкую Рэспубліку Паўночнага Кіпру, якую сама арганізавала, заваяваўшы поўнач вострава. Адначасова Турцыя не прызнае армянскага Карабаху. Прытым Турцыя ваюе з курдзкімі партызанамі нашмат больш крывава, чым Мілошавіч — з Арміяй Вызваленьня Косава, і пагражае вайной у выпадку, калі Курдыстан у суседнім Іраку абвесьціць незалежнасьць.

А вось Расея. Маючы Чачэнію і дзясяткі іншых аўтаноміяў, катэгарычна супраць незалежнасьці Косава.

У Эўрасаюзе за незалежнасьць Косава рукамі і нагамі выступаюць каталёнцы, баскі, шатляндцы і іншыя пакрыўджаныя гісторыяй народы. За незалежнасьць таксама вялікія дзяржавы — Нямеччына, Брытанія, Францыя, з розных меркаваньняў — часам ідэалістычных, часам рэалістычных. Супраць Гішпанія (што баіцца мірнага самараспаду), Румынія (з салідарнасьці з братамі-малдаванамі, якія маюць Прыднястроўе), вагаецца Славаччына (бо раёны кампактнага пражываньня вугорцаў мяжуюць зь іх мэтраполіяй), Кіпр (і Грэцыя разам зь ім).

Парушэньне прынцыпу непарушнасьці межаў чапляе самыя розныя краіны. Таму, напрыклад, Шры-Ланка, скрываўленая вайной з тамільскімі незалежнікамі, пабачыла ў Косаве «пагрозу міру ва ўсім сьвеце».

Аднак у сытуацыі вакол Косава бачныя й пазытыўныя тэндэнцыі. Па-першае, кепскі мір лепшы за добрую вайну. Па-другое, сэрбскія вярхі дэманструюць новую якасьць — стрыманасьць. Вільня таксама важная для самасьвядомасьці беларусаў, як Косава для сэрбаў, а Канстантынопаль важны для грэкаў, але ні беларусы, ні грэкі не ідуць адваёўваць свае памяткі. Гэта паказвае, што выйсьце бывае з самых безвыходных сытуацыяў. Фактам было, што косаўскія альбанцы адмаўляліся жыць пад сэрбамі, а сэрбы адмаўляліся адпусьціць іх зь мірам. Такая, залежная ад ЗША і Эўропы,





незалежнасьць, прынамсі, дае магчымасьць мірнага разводу. Як паказвае прыклад СССР ці Чэхаславаччыны, праходзіць ня так шмат часу, і пра развод ужо ніхто не шкадуе. Сьвет мае-такі шанец рабіцца і справядлівейшым, і бясьпечнейшым адначасова.

### Доўгі шлях да самастойнасьці

Косава пачало барацьбу за незалежнасьць у 1970-я, калі край нават ня меў дзяржаўнага статусу ў былой Югаславіі. Агмянём нацыянальна-вызвольнае барацьбы быў унівэрсытэт Прыштыны, а маральным лідэрам руху — філёзаф Ібрагім Ругова, які памёр нядаўна, так і не пабачыўшы сваёй краіны цалкам незалежнай, але засьпеў фармаваньне самастойных дзяржаўных структураў пад апекай Эўропы і ЗША.

Косава займае 10 тыс. кв. кілямэтраў (гэта чвэрць плошчы Менскай вобласьці), а насельніцтва мае крыху большае за 2 млн чалавек. Больш за 90% новай краіны складаюць альбанцы. 120 тыс. сэрбаў пражываюць у раёнах на поўначы Косава, а таксама анклявах. На тэрыторыі новай краіны дзейнічае таксама сьвет праваслаўных сэрбскіх манастыроў: Мітравіца, Грачаніца, Дэкані, Прызрэн, Печ і іншыя.

### Беларусь не прызнала

Міністэрства замежных справаў Беларусі заявіла, што не прызнае незалежнасьці Косава. «Рэспубліка Беларусь лічыць, што ўрэгуляваньне пытаньня пра статус краю Косава і Мэтохія мусіць праходзіць у міжнародна-прававой плоскасьці на падставе рэзалюцыі Рады Бясьпекі ААН 1244 (1999)». «Рэспубліка Беларусь пэўная, што адзіным шляхам пераадоленьня напружанасьці й дасягненьня стабільнасьці ў рэгіёне застаецца палітычнае ўрэгуляваньне, якое прадугледжвае вяртаньне да перамоўнага працэсу між Бялградам і Прыштынай пры магчымым удзеле міжнародных пасярэднікаў», — гаворыцца ў паведамленьні МЗС Беларусі.

Дзяржаўная прапаганда выкарыстала Косава для ўмацаваньня масавых забабонаў што да Захаду, аднак большасьць беларусаў падыходзяць да косаўскага пытаньня — вельмі абстрактнага — з пазыцыі хутчэй уласных ідэяў. Адны маюць сымпатыі да ўсіх незалежніцкіх рухаў — пытаньне незалежнасьці застаецца ў Беларусі палітызаваным. Другія маюць постплемянныя або крыптарасейскія сымпатыі да славянаў. Трэція, наадварот, ацэньваюць косаўскі вузел праз прызму сваёй антыпатыі да ЗША або да мусульманаў. Няма таго, як у 1999 г., калі лукашысты аднолькава асуджалі «натаўскіх агрэсараў», а незалежнікі цешыліся «паразе Мілошавіча». Беларускае грамадзтва стала за гэтыя гады больш фрагмэнтаваным.

### Дзяржава, але ці нацыя таксама?

Дзяржавай Косава стала, і пытаньне прызнаньня — гэта толькі пытаньне часу. Ці стане Косава нацыяй? Ці з часам яно папросту далучыцца да Альбаніі? Сёньня з Тыранай касавараў лучыць мова, але падзяляюць гістарычны досьвед і кланавыя адрозьненьні. Многа будзе залежаць ад ангажаванасьці амэрыканцаў і эўрапейцаў у новай краіне. Будуць яны толькі трымаць мір ці будуць таксама дапамагаць выбудаваць нацыянальныя інстытуты, дзяржаўны апарат, сілы бясьпекі?

Эўрасаюз да Косава бліжэйшы, але ЭС ня мае досьведу нацыятворэньня. Гэта новы выклік для эўрапейцаў, адзіным папярэднім досьведам была Босьнія і Герцагавіна, і вынік яго пакуль больш чым няясны. Зь іншага боку, перанос інтэграцыйных працэсаў з рэгіянальнага на кантынэнтальны ўзровень дае большую самастойнасьць рэгіёнам памерам з Косава ў самой Эўропе, прычым такім, дзе нацыянальная тоеснасьць не мацнейшая за косаўскую.

ЗША маюць большую практыку. Яны паставілі на ногі Карэю, Тайвань, Ізраіль (Нямеччына, Японія, Італія былі трохі іншымі выпадкамі). Цяпер спрабуюць тое самае зрабіць з Іракам, Аўганістанам. Аднак калі ЗША аслабнуць, Косаву прыйдзецца цяжэй без абарончага парасона ў атачэньні варожых дзяржаваў побач з слабой Альбаніяй. Калі ЗША аслабнуць, ніхто не застрахаваны ад новай балканскай вайны з удзелам усіх старых знаёмых — Турцыі, Сэрбіі, Грэцыі...

Будучыня Косава залежыць ад будучыні замежнай палітыкі Вашынгтону. Хоць пасьля прэзыдэнцтва Буша — аднаго з найслабейшых і найменш папулярных ва ўласнай краіне і ў сьвеце кіраўнікоў ЗША — Штаты могуць ажыцьцявіць паварот, але, напэўна, не такі істотны, каб адмовіцца ад ідэйных і геапалітычных прыярытэтаў у «мяккім падчарэўі Эўропы», як калісьці назваў Балканы Чэрчыль. Косаўскія альбанцы папросту скарысталіся тым, што сьвет стаў глябальны.

#### Этнічнае мінулае

Косава — спрадвечны сэрбскі край? Гэта не зусім так.

Вось як на гэтае пытаньне адказвае адзін з наведнікаў сайту nn.by. «Славяне зьявіліся на Балканах у VII ст. нашай эры. Таго часу на абшары сёньняшняга Косава ўжо існаваў племянны хаўрус дарданаў (ілірыйскага племені, ад якіх альбанцы вядуць свой радавод). Доўгі час протасэрбы й протаальбанцы жылі разам, і калі казаць пра іхную канфэсійную прыналежнасьць, дык у Сярэднявеччы і першыя, і другія былі хрысьціянамі. Так што дэманстрацыя па БТ праваслаўных храмаў XII ст. як сьведчаньне «спрадвечнай сэрбскасьці» Косаўскага краю выглядаюць недарэчнымі. Тэрыторыя Косава была далучаная да Сэрбіі паводле Бухарэсцкай мірнай дамовы ў 1913 г. Край быў населены ў асноўным альбанцамі, аднак на баку Сэрбіі стаяла Расея, а інтарэсы шчыптараў ніхто зь вялікіх дзяржаваў абараняць не пажадаў. Адначасова з Косава былі дэпартаваныя прыкладна 400 тысячаў мусульманаў. І хаця дэпартаваных называлі туркамі, гэта былі ў сваёй асноўнай масе альбанцы. І апошняе. За часамі Мілошавіча было зьнішчана прыкладна 10 тысячаў касавараў, 800 тысячаў сталі ўцекачамі».

Косава сапраўды шмат значыць для сэрбаў ад часоў велічнае бітвы на Косавым полі, калі туркі скрышылі сілы сэрбскіх фэадальных князстваў і скончыўся залаты век сэрбскага люду.

Як глядзець на незалежнасьць Косава з пазыцыі беларускіх нацыянальных інтарэсаў? Адну з вэрсіяў дае камэнтар Андрэя Ляховіча **на старонцы 6**.

# Незалежнае Косава патрэбнае Беларусі

Гэта нявыгадна Расеі, але гэта добра для нас. Піша палітоляг **Андрэй Ляховіч.**

Пасьля абвяшчэньня незалежнасьці Косава ў Беларусі прагучалі тры думкі адносна гэтай падзеі. Адны казалі, што альбанцы захапілі сэрбскія землі і цяпер зацьвердзілі гэты захоп. ЗША і краіны ЭС несправядліва паступаюць у дачыненьні да сэрбаў… Другая думка: гэта не закране Беларусі, не адаб’ецца на характары стасункаў Беларусі зь іншымі краінамі, у тым ліку з Расеяй. Трэцяя думка: гэта створыць ўмовы для большага збліжэньня Расеі з Сэрбіяй, якая будзе змагацца за вяртаньне Косава.

Не прагучала толькі адно, можа быць, самае істотнае. Ці адпавядае незалежнасьць Косава нашым, беларускім нацыянальным, інтарэсам? Усе буйныя палітычныя падзеі, што адбываюцца ў сьвеце, трэба разглядаць праз прызму інтарэсаў беларускай дзяржавы.

Па-людзку, мы, беларусы, спачуваем сэрбам. Яны славяне. Яны размаўляюць, ужываючы словы, якія мы разумеем. Іх прозьвішчы сканчаюцца на «-віч», як і ў шмат якіх беларусаў. Яны больш падобныя да жыхароў Беларусі за цёмнавалосых альбанцаў, пра якіх кажуць: «эўрапейскія чачэнцы». Сэрбы — праваслаўныя хрысьціяне, як і значная частка нашых грамадзянаў. Мы спачуваем іхнай гераічнай і трагічнай гісторыі. Калі б Сэрбія была больш блізкай да нас геаграфічна, можна не сумнявацца, што нашыя продкі ў бітве на Косавым полі, у 1389 г. стаялі б побач зь імі супраць туркаў.

Але мы не павінныя бачыць сьвет, як «рускія, толькі з знакам якасьці». Мы — эўрапейцы. Нашыя пэрспэктывы — у Эўропе. Як і ў немалой колькасьці пытаньняў усясьветнай палітыкі, інтарэсы Беларусі і Расеі ў «косаўскім пытаньні» разыходзяцца.

Пры наяўных гарантыях, што Косава ня будзе часткай «вялікай Альбаніі», а менавіта незалежнай краінай, якая будзе інтэгравацца ў склад ЭС, зьяўленьне новай дзяржавы азначае лягічны крок на шляху будаваньня адзінай эўрапейскай эканамічнай, палітычнай, гуманітарнай, абароннай прасторы. Зьмяншаецца «белая пляма» на балканскай частцы Эўропы.

Сэрбіі, якая з часам будзе вымушаная зьмірыцца з стратай Косава (няма іншых варыянтаў: сэрбы складаюць толькі 6% з двухмільённага насельніцтва Косава), будзе прасьцей інтэгравацца ў ЭС — бяз косаўскага хваста. У Бялграду не было ні людзкіх, ні эканамічных рэсурсаў, каб цывілізавана вырашыць «косаўскае пытаньне». Выкарыстоўваньне ваеннай сілы за часамі Мілошавіча толькі рабіла гэтае пытаньне больш вострым для Эўропы. Калі Сэрбія не змагла вырашыць гэтае пытаньне і інтэгравацца ў Эўропу, то вырашэньне косаўскай праблемы без удзелу Сэрбіі становіцца адпаведным інтарэсам Сэрбіі. Бо кірунак яе разьвіцьця вызначаны месцам на эўрапейскай тэрыторыі — рух у ЭС. ЗША і ЭС, НАТО за сэрбскі ўрад вырашаюць праблему, якую афіцыйны Бялград ня змог бы вырашыць, хаця б таму, што ня мог прыняць вельмі непапулярнае рашэньне адпусьціць Косава.

Беларускім нацыянальным інтарэсам адпавядае зьяўленьне, у пэрспэктыве, сярод краінаў ЭС Косава як краіны, арыентаванай на ЗША і краіны «нестарой Эўропы». ЗША найбольш рашуча падтрымліваюць незалежнасьць Косава, у тым ліку таму што дбаюць і пра свае інтарэсы ў Эўропе. Злучаныя Штаты і цэнтральнаэўрапейскія краіны заўсёды займалі ў пытаньні падтрымкі незалежнасьці і дэмакратычнага разьвіцьця Беларусі больш пасьлядоўную, акрэсьленую пазыцыю, чым краіны «старой Эўропы». Сярод апошніх часта знаходзіліся тыя, хто ў «беларускім пытаньні» зіркаў на пазыцыю «маскоўскіх партнэраў». Яшчэ не так даўно «старыя эўрапейцы» казалі пра «дэмакратызацыю Беларусі праз Расею». І толькі «доктар Пуцін» апошнім часам вылекаваў іх ад гэтай хваробы. Але пытаньне — ці назаўжды?

З аднаго боку, падтрымка Масквой Бялграду ў пытаньні Косава тлумачыцца тым, што Крэмль вельмі зацікаўлены ў захаваньні белай плямы, агмяню канфліктаў на эўрапейскай тэрыторыі. Падтрымка Сэрбіі заўсёды была адным з элемэнтаў палітыкі стрымліваньня НАТО і ЭС, зручнай падставай умешвацца ў эўрапейскія справы, кажучы пра падвойныя стандарты Захаду. У Маскве добра разумеюць, што пасьля інтэграцыі ў свой склад балканскіх краінаў НАТО будзе распаўсюджвацца далей на ўсход. Павялічацца рэсурсы і магчымасьці НАТО стрымліваць Расею, гарантаваць незалежнасьць былых савецкіх рэспублік.

З другога боку, Расея імкнулася працягнуць існаваньне неакрэсьленага статусу Косава (фактычная незалежнасьць пры яе юрыдычнай адсутнасьці), маючы на ўвазе свае інтарэсы на постсавецкай прасторы. Пакуль пры ўсіх нафта- і газадалярах, ВУП Расеі складае каля 1,2 трлн даляраў. Гэта трохі больш за ВУП Партугаліі… Пакуль Расея ня можа ясна заявіць пра сваю пазыцыю адносна Паўднёвай Асеціі, Абхазіі, Прыднястроўя… усходняй часткі Ўкраіны, Крыму… Бо ня мае дастатковых эканамічных рэсурсаў, дастатковай моцы. Таму Пуцін 17 лютага і сказаў, што Расея ня будзе «обезьянничать» у адказ на абвяшчэньне незалежнасьці Косава. То бок, што Расея пакуль не падтрымае ўжо ня першыя заклікі Абхазіі, Паўднёвай Асеціі, Прыднястроўя прызнаць іх незалежнасьць, а потым прыняць у свой склад.

# Пасол усяе Беларусі

Дыпляматычны прадстаўнік нашай краіны ў Швэцыі наведаў мерапрыемства з удзелам апазыцыйных палітыкаў.

На мінулым тыдні дэлегацыя беларускай апазыцыі ў складзе Ўладзімера Навасяда, Паўла Севярынца і Міколы Статкевіча наведала Стакгольм. 12 лютага у будынку Рыксдагу прайшоў сэмінар «Месца Беларусі ў сучаснай Эўропе».

Са словаў палітыка Паўла Севярынца, міністар эўрапейскай інтэграцыі Сэсілія Мальстрам запэўніла, што Беларусь чакаюць у аб’яднанай Эўропе. Швэцыя ж у сваю чаргу гатовая быць праваднiком беларускіх інтарэсаў у Эўрасаюзаўскіх структурах.



Цікава, што мерапрыемства таксама наведаў пасол Беларусі ў Швэцыі Андрэй Грынкевіч. Гэта ці ня першы выпадак, калі афіцыйны пасланьнік Менску ў Стакгольме прыняў удзел у адным мерапрыемстве з апазыцыйнымі палітыкамі. «Для ўсіх гэта была вялікая нечаканасьць і неспадзяванка, што спадар пасол завітаў да нас. Ён нават выступіў з прамовай. Разам з тым, ягоныя словы абсалютна ніяк не супярэчылі нашай пазыцыі», — кажа П.Севярынец.

**Зьміцер Панкавец**

# Партыя БНФ мацуе ўнутрыпартыйную дысцыпліну

На апошнім Сойме Партыі БНФ 16 лютага быў прыняты дакумэнт «За партыйную этыку і дысцыпліну». Сярод іншага, дакумэнт утрымлівае наступныя палажэньні: «Недапушчальнай лічыцца публічная крытыка якіх-кольвечы рашэньняў Зьезду, Сойму Партыі, а таксама дзеяньняў і выказваньняў старшыні, намесьнікаў старшыні, сябраў Сойму Партыі ў прысутнасьці сябраў іншых партый ці беспартыйных асоб або ў непартыйнай прэсе».

Старшыня Партыі БНФ **Лявон Баршчэўскі** кажа, што падобныя пункты ў статутах ёсьць у многіх эўрапейскіх партый.

«Дакумэнт цалкам адпавядае нашаму статуту. Ён парадкуе звычаёвае права, якое існуе ў кожнай арганізацыі. Напрыклад, сябар нашай партыі ня можа агітаваць за іншую партыю ці палітычную структуру», — кажа Л.Баршчэўскі.

**Зьміцер Панкавец**

## Белы Дом выдзяляе Лябедзьку

У пачатку сьнежня дэлегацыя беларускай апазыцыі ў складзе Аляксандра Мілінкевіча, Сяргея Калякіна, Паўла Севярынца, Анатоля Лябедзькі, Анатоля Ляўковіча, Эніры Браніцкай і Зьмітра Хведарука знаходзілася зь візытам у Вашынгтоне і мела сустрэчу з Джорджам Бушам.

На тым тыдні лідэр АГП Анатоль Лябедзька атрымаў ліст ад амэрыканскага прэзыдэнта. У ім Дж.Буш высока ацаніў дыскусію, якая адбылася падчас сустрэчы, падзякаваў за напульсьнік «За свабоду», — адзначаецца ў паведамленьні прэс-службы АГП.

Кожнаму ўдзельніку візыту праз пасольства ЗША перадалі фота з сустрэчы з Бушам. Цікава, што асабістае пасланьне ад прэзыдэнта ЗША атрымаў толькі Анатоль Лябедзька.

**ЗП**

## СЬЦІСЛА

### Бундэстаг не зьмяніў кошт візы для беларусаў

Кошт шэнгенскіх візаў для беларусаў застаецца ранейшым — 60 эўра. Аднак называюцца катэгорыі «льготнікаў», якія рашэньнем консула будуць пазбаўленыя візавых збораў. Дакумэнт паводле праекту кіроўнай парлямэнцкай кааліцыі — хрысьціянскіх і сацыял-дэмакратаў, — накіраваны на разгляд у нямецкі ўрад. Апазыцыя прапаноўвала зьнізіць кошт візаў для беларусаў з 60 да 35 эўра і пазбавіць збораў усіх бяз вынятку «ільготнікаў». Іначай, як заявіла дэпутатка ад фракцыі «зялёных» Марылуіза Бэк, цяперашняя сытуацыя нагадвае «другі бок мэдаля бэрлінскай сьцяны».

### Яшчэ тры сьвідравіны

Прэзыдэнт Вэнэсуэлы абвясьціў пра выдзяленьне Беларусі трох дадатковых нафтавых радовішчаў. Пра гэта стала вядома ў часе ягонай сустрэчы зь **Віктарам Шэйманам**, што чарговы раз наведаў Каракас.

### Працяг справы Васілеўскага

Генпракуратура пачала справу ў сувязі з забойствам у ЗША беларускага студэнта («НН» пісала пра гэта ў 2006-м). 20-гадовы ўраджэнец Шчучына Аляксей Васілеўскі вучыўся ў БНТУ. Ён трапіў у ЗША ў рамках праграмы «Праца і падарожжа». У горадзе Ўэлс, штат Мэн, уладкаваўся на працу ў службу дастаўкі піцы. 20 чэрвеня 2006 г. цела Васілеўскага знайшлі каля інтэрнату для замежнікаў, дзе ён жыў. Справа застаецца нераскрытай. Улады штату Мэн вырашылі перагледзець справу пад націскам сям’і і беларускага пасла ў ЗША. У Генпракуратуры Беларусі адмаўляюцца паведаміць падрабязнасьці, аргумэнтуючы гэта тайнай сьледзтва.

### Расея пакінула саюзьнікаў без пшаніцы

Урад Расеі ўвёў забарону на экспарт пшаніцы і мясьліну (жытнёва-пш анічнай сумесі) у краіны, якія ўваходзяць у Мытны саюз, гэта значыць у Беларусь і Казахстан. Гэты крок зроблены для таго, каб расейскае зерне не экспартавалася цераз краіны Мытнага саюзу без уплаты экспартнага мыта, уведзенага Расеяй.

**МБ; БелТА, радыё «Свабода», regnum.ru, «КП в Беларуси»**

# Заходнярусы па-ранейшаму ў пашане

Новы рэдактар «Беларускай думкі» захапляецца Мураўёвым—Вешальнікам.

Пятнічны нумар газэты «Звязда» друкуе інтэрвію з новым кіраўніком ідэалягічнага пражэктара, заснавальнікам якога зьяўляецца Адміністрацыя прэзыдэнта. Былога рэдактара Ўладзімера Вялічку замяніў Вадзім Гігін.

Ён скончыў гістфакультэт БДУ, кандыдат гістарычных навук, працаваў у прэс-службе генэральнай пракуратуры (пад крылом праславутага Юр’я Азаронка), кіраваў Менскай гарадзкой арганізацыяй БРСМ.

На гэтай пасадзе В.Гігін здабыў сабе вядомасьць заявай пра Мураўёва-вешальніка. У верасьні летась у інтэрвію газэце «Знамя юности» ён абвесьціў: «Можа, трохі нестандартны выбар, але мне заўсёды імпанаваў віленскі генэрал-губэрнатар Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў, які здушыў паўстаньне 1863 г. Я добра вывучыў ягоную біяграфію. Гэта быў надзвычайны чалавек, адміністратар, кіраўнік, які можа служыць прыкладам для любога дзяржаўнага дзеяча».

На пытаньне журналіста «Звязды», якія праблемы вас сёньня хвалююць, В.Гігін адказвае: «Напрыклад, некаторыя тэндэнцыі ідэалізацыі пэрыяду існаваньня Вялікага Княства Літоўскага.



Я лічу, што ідэалізацыя ... дадзенага гістарычнага пэрыяду можа прывесьці да ... перакосу нашай ідэалягічнай канцэпцыі. ... Ня ўсё там [у ВКЛ] было проста, не ў такім добрым становішчы знаходзіўся тады беларускі народ. Беларусы на працягу стагодзьдзяў вялі барацьбу супраць Княства Літоўскага».

Ад студзеня, пад прыход аматара Мураўёва часопісу «Беларуская думка» далі дадатковае фінансаваньне: часопіс стаў каляровым. Пасьля леташняй рэарганізацыі часопіс «Беларуская думка» ўвайшоў у склад РУП «Беларускае тэлеграфнае агенцтва».

У першым сёлетнім нумары «Беларускай думкі», выданьні для «прадстаўнікоў органаў дзяржкіраваньня, дэпутацкага корпусу, усіх, хто мае дачыненьне да ідэалягічнай, інфармацыйна-прапагандысцкай работы, а таксама вынаходнікаў-рацыяналізатараў», як ахарактарызаваў яго В.Гігін, друкуецца інтэрвію з намесьніцай кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Натальляй Пяткевіч. Сп.Пяткевіч адказвае на пытаньні адносна адмены льгот. На яе думку, у гэтым пытаньні «няма рэзкіх зьмен».

У круглым стале па пытаньні «Ўлада і мастак: разам ці паасобку» ўдзельнічаюць ня толькі дырэктар «Мастацкай літаратуры» Аляксандар Карлюкевіч і намесьнік міністра культуры Віктар Кураш, а і музыка Піт Паўлаў.

Таксама ў нумары інтэрвію з старшынёй ЦВК Лідзіяй Ярмошынай, якая сьцьвярджае, што выбаршчыкі Беларусі заўсёды прымаюць вынікі выбараў як дадзенасьць.

Сакавіцкі нумар Вадзім Гігін абяцае прысьвяціць міжнароднай палітыцы. Прынамсі, будзе ўзьнятае пытаньне Косава.

**Зьміцер Панкавец**

# Міхалевіч супраць «Советской Белоруссии»

У судзе Савецкага раёну сталіцы адбыўся папярэдні разгляд справы на позву намесьніка старшыні Партыі БНФ Алеся Міхалевіча да газэты «Советская Белоруссия» і яе журналіста Арцёма Чалядзінскага. Міхалевіч зьбіраецца дамагацца таго, каб «Советская Белоруссия» надрукавала абвяржэньне інфармацыі, што палітык не вырасьціў за жыцьцё ніводнага вядра бульбы, на другой паласе газэты, а таксама сплаціла маральную кампэнсацыю ў памеры 6160 рублёў — столькі каштуе пустое вядро для бульбы ў ГУМе.

У судзе «СБ» прадстаўляла юрысконсульт газэты Вольга Раманава. Паводле яе словаў, «Арцём Чалядзінскі» — гэта псэўданім галоўнага рэдактара газэты Паўла Якубовіча. Юрысконсульт заявіла, што аўтар артыкулу выкарыстаў «літаратурны прыём».

Разгляд паводле судовай справы прызначаны на 14 сакавіка а 10.00 у судзе Савецкага раёну г. Менску. Справу будзе разглядаць судзьдзя Аляксей Таманаў.

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### Жалезьнічэнка застанецца ў войску

14 лютага суд Савецкага раёну Гомеля пакінуў у сіле рашэньне райваенкамату аб прызыве на службу Зьмітра Жалезнічэнкі («НН» №6). Хлопец быў адлічаны з Гомельскага дзяржунівэрсытэту імя Скарыны, хоць быў выдатнікам вучобы, ды праз чатыры дні сьпехам прызваны ў войска. 8 лютага судзьдзя Юры Жораў задаволіў скаргу бацькоў юнака і прыпыніў рашэньне вайсковай камісіі аб прызыве. Аднак пасьля той самы судзьдзя адмяніў уласнае рашэньне «ў сувязі з новымі абставінамі». Што гэта за абставіны, у судзе не канкрэтызавалася.

### Прысяга ў вернасьці размеркаваньню

У Чашніках маладых спэцыялістаў змусілі даць «клятву вернасьці». Каб яны не зьбягалі, райкам БРСМ і райвыканкам прыдумалі гэты рытуал для ўсіх дасланых у раён па разьмеркаваньні. Прыехаў — абсядзь! Кіраўніца ідэалягічнага аддзелу райвыканкаму Тацяна Пчолкіна распавяла, што ў лютым цераз яго ўжо прайшлі 98 выпускнікоў навучальных установаў, якія прыбылі ў Чашніцкі раён на першую ў сваім жыцьці працу.

**МБ; BulletinOnline.org, радыё «Рацыя»**

# Непразрысты продаж Velcom'у — дзяржаўная палітыка

«На момант продажу апэратара мы вялі перамовы з Расеяй наконт цэнаў на газ, змагаліся за кожны даляр», — патлумачыў леташнюю сытуацыю вакол МЛС старшыня Дзяржкамітэту па маёмасьці Беларусі **Георгі Кузьняцоў**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«Гэта была палітыка нашай дзяржавы. Акурат тады адбываліся перамовы з Расеяй наконт цэнаў на газ, мы змагаліся за кожны даляр. Была дамова з пакупнікам МЛС — да паступленьня сродкаў ад продажу дзярждолі ў бюджэт усё мусіла быць канфідэцыйна», — распавёў журналістам пра асаблівасьці продажу Velcom Георгі Кузьняцоў. Паводле словаў дырэктара Фонду дзяржмаёмасьці Натальлі Жарнасек, усе сродкі, атрыманыя ад продажу дзярждолі кампаніі, згодна заканадаўству патрапілі ў бюджэт. У выніку гэтая сума склала $556 млн. Н. Жарнасек падкрэсьліла, што МЛС на момант продажу зьяўляўся сумесным прадпрыемствам, таму заканадаўства выключала публічнасьць таргоў.

Адказваючы на пытаньне пра сьпіс аб'ектаў дзяржаўнай уласнасьці, падрыхтаваных да продажу ў 2008 г., Натальля Жарнасек паведаміла, што яго падрыхтуюць да канца лютага — пачатку сакавіка. «Наконт МАЗу, МТЗ, «Беларуськалію» ды іншых прадметных прапановаў ад галіновых органаў дзяржаўнага кіраваньня па рэфармаваньні гэтых прадпрыемстваў не паступала», — зазначыла дырэктар Фонду дзяржмаёмасьці. Але гэта не азначае, што адпаведныя прапановы ня могуць зьявіцца.

На сёньня ў Беларусі налічваецца каля 13500 аб'ектаў маёмасьці, што не выкарыстоўваюцца па прызначэньні і не знаходзяцца ў гаспадарчым звароце, паведаміла Н. Жарнасек. Каля 60% гэтых аб'ектаў будуць перапрафіляваныя і, пасьля вяртаньня ў гаспадарчы зварот, застануцца ва ўласнасьці дзяржавы. Каля 25—30% такіх аб'ектаў будуць прададзеныя. Часьцей за ўсё гэта разбураныя ці недабудаваныя будынкі.

У мінулым годзе сумарныя паступленьні ад продажу дзяржуласнасьці, атрыманьня дывідэндаў ад акцыяў прадпрыемстваў, долі прыбыткаў прадпрыемстваў, прыбыткаў ад арэнды склалі 649 млрд руб. Сёлета заплянавана атрымаць на 10—15% больш. Плянуецца, што ад продажу дзяржмаёмасьці ў бюджэт паступіць каля 4,7 млрд руб, аднак у Дзяржкамітэце па маёмасьці не выключаюць, што выніковая лічба значна перавысіць заплянаваную.

**Сямён Печанко**

# Сямашка: «У энэргетыку пусьцяць прыватны капітал»

Беларусь «закладзе першы камень у будаўніцтва АЭС у студзені 2009 году», паведаміў першы віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка 15 лютага на калегіі Міністэрства энэргетыкі, што адбылася ў Навалукам'і. У красавіку гэтага году будзе вызначана месца для будучай АЭС з імавернасьцю 80—90%, а да канца году канчаткова вызначаная пляцоўка.

Пра рашэньне будаваць АЭС афіцыйна ўжо паведамілі кіраўніку МАГАТЭ. Першы блёк атамнай электрастанцыі ў Беларусі плянуецца ўвесьці ў 2016 годзе, а другі — у 2018-м. Пры гэтым першы віцэ-прэм'ер падкрэсьліў, што згодна з усясьветнай практыкай, падрыхтоўка пэрсаналу станцыі павінна пачынацца за 10 гадоў да ўводу АЭС.

Па-ранейшаму застаецца невядомым, хто пабудуе беларусам АЭС. Найбольш актыўна пра свой намер паўдзельнічаць у праекце заяўляюць Расея і Францыя, пасланы якіх на апошніх прэс-канфэрэнцыях агучылі адпаведныя заявы.

У Беларусі рыхтуецца закон аб электраэнэргетыцы і закон аб малой і аднаўляльнай энэргетыцы. Адным з важных пытаньняў у праекце закону аб электраэнэргетыцы будзе тое, што «ў генэрацыю можа прыйсьці прыватны капітал». Таксама дзяржава зьбіраецца разьвіваць і нетрадыцыйную энэргетыку.

У працяг рэфармаваньня электраэнэргетычнай галіны створаць сеткавую кампанію, якая будзе працаваць як зь дзяржаўнымі, так і з прыватнымі прадпрыемствамі, адзначыў першы віцэ-прэм'ер. Ён падкрэсьліў, што для работы кампаній на электраэнэргетычным рынку павінны быць створаныя празрыстыя ўмовы. Разам з тым працэс рэфармаваньня «Белэнэрга» будзе праходзіць паступова.

У.Сямашка пазытыўна ацаніў супрацоўніцтва з «Газпромам» і анансаваў працяг і разьвіцьцё супрацы. Гэтак, урад хоча з дапамогай «Газпрому» пашырыць магутнасьці газасховішчаў.

**Сямён Печанко; паводле БЕЛТА**

## СЬЦІСЛА

### Сідорскі пакараў міністраў

Шэраг міністраў і кіраўнікоў канцэрнаў прыцягнутыя да дысцыплінарнай адказнасьці за невыкананьне прагнозных паказчыкаў за 2007 год — студзень 2008 году. Паводле крыніцаў ва ўрадзе, вымовы атрымалі міністры будаўніцтва і архітэктуры, сельскай гаспадаркі і харчу, прамысловасьці і энэргетыкі, а таксама кіраўнікі канцэрнаў «Беллегпрам» і «Белдзяржхарчпрам».

### Дзяржава купляе газ па $119, а людзям прадае па $215

Беларусь купляе ў Расеі газ па 119 даляраў за 1000 кубоў. Тарыф 1 кубамэтру для насельніцтва — 462 рублі (пры ўмове адсутнасьці індывідуальных газавых ацяпляльных прыладаў). Выходзіць, нам прадаюць газ прыкладна па 215 даляраў за 1000 кубоў.

### Газ падаражэе яшчэ трохі

Цана імпартаванага Беларусьсю прыроднага газу ў 2008 г. вырасьце ў сярэднім на 25,3% у параўнаньні зь мінулым годам, паведаміў Міністар энэргетыкі Аляксандар Азярэц. Гэта азначае, што яна складзе ў сярэднім 125,3 даляра.

### Сярэдні заробак па Менску — 994 тыс.

У пераводзе на звыклыя беларускаму народу даляры, гэта складае 462 у.а. Нагадаем, што паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі і аналізу, налічаны сярэдні заробак працаўнікоў у Беларусі, паводле зьвестак на сьнежань, складаў 795 тыс. 386 руб.

**СП; БЕЛТА, kp.by**

# Згасаньне актыўнасьці

На акцыю пратэсту дробных прадпрымальнікаў 18 лютага сабралася некалькі соцень маніфэстантаў. З Кастрычніцкай плошчы іх выціснуў спэцназ, якому камандзіры ўвесь час нагадвалі пра неабходнасьць пасьміхацца.

Ужо трэці раз за паўтара месяцы прадпрымальнікі выйшлі на Кастрычніцкую плошчу Менску, каб патрабаваць адмены прэзыдэнцкага ўказу № 760. Калі дзьве першыя акцыі, 10 і 21 студзеня, былі досыць масавымі, то 18 лютага прадпрымальніцкая актыўнасьць прыгасла. Частка дробных гандляроў пасьпела зьмірыцца з указам, іншыя завязалі зь бізнэсам, трэція перабраліся ў Расею.

Агулам у панядзелак на плошчу ад сілы прыйшло чалавек дзьвесьце. Пры гэтым міліцыянты так і не дазволілі людзям згуртавацца. Як толькі зьбіралася група людзей, большая за два дзясяткі, байцы спэцназу пачыналі адціскаць яе за Палац Рэспублікі, а ўжо пасьля на Пляц Волі. Праўда, у хуткасьці ўсіх адпускалі. Знаёмая журналістка пры канцы акцыі скардзілася: «Пяты раз выганяюць з Кастрычніцкай. Стамілася ўжо».

Па пэрымэтры плошчы былі расстаўленыя аўтазакі. На папярэдніх акцыях такіх вялікіх мераў перасьцярогі не было. Дзяжурыла міліцыя і ў падземных пераходах.

Лідэры прадпрымальніцкага руху Алесь Таўстыка, Віктар Гарбачоў, Віктар Калей, старшыня АГП Анатоль Лябедзька, а таксама большасьць журналістаў першымі трапілі ў кола спэцназаўцаў. Адцясьнілі ў бок Опэрнага тэатру. На плошчы пастаянна заставалася толькі Крысьціна Шацікава, якая пры зьяўленьні спэцназу сядала долу. Паспрабаваўшы некалькі разоў яе падняць, байцы вырашылі адчапіцца ад жанчыны.

Частка людзей — чалавек 30—50 — увесь час стаяла на скрыжаваньні праспэкту Незалежнасьці і вуліцы Энгельса, але на плошчу выходзіць не наважваліся. Пэўны час на плошчы фактычна не было ніякіх транспарантаў. Толькі Вольга Казуліна разгарнула расьцяжку ў падтрымку свайго бацькі: «Свабоду Казуліну». Ужо праз пяць хвілін яе закінулі ў аўтазак і адвезьлі ў Цэнтральны РУУС. Для прыліку патрымаўшы там з гадзіну, Вольгу выпусьцілі.

На подступах да плошчы быў затрыманы Аляксандар Мілінкевіч з сваімі памочнікамі Алесем Лагвінцом і Аляксеем Кавальцом. Пяць супрацоўнікаў у цывільным затрымалі іх «праверыць дакумэнты», пасьля чаго адвезьлі ў сьледчы аддзел МУС (вул. Сапэраў, 7). Там усіх паасобку дапыталі ў якасьці сьведкаў паводле крымінальнай справы за акцыю 10 студзеня. Пасьля іх таксама адпусьцілі.

Частка прадпрымальнікаў зьбіралася рушыць да будынку тэлеканалу АНТ, але дайсьці да вул.Камуністычнай, 6 вялікай групай так і не ўдалося. Як потым стала вядома, прадпрымальнікі ўсё ж змаглі перадаць зварот на Белтэлерадыёкампанію з патрабаваньнем жывога этэру.

Лідэры прадпрымальніцкага руху ўжо заявілі пра падтрымку вулічнай акцыі на Дзень Волі.

**Зьміцер Панкавец**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## 12 лютага

### У Горках дастаткова афіцыйных газэтаў

Горацкі райвыканкам не дазволіў партыйнаму актывісту **Эдуарду Брокараву** выдаваць газэты. Паводле пастановы, падпісанай старшынём райвыканкаму **Міхаілам Анікеевым**, у раёне афіцыйна выходзяць тры газэты, якія цалкам забясьпечваюць насельніцтва інфармацыяй. Райвыканкам зарэгістраваў актывіста індывідуальным прадпрымальнікам з правам займацца рэклямнай дзейнасьцю ды гандлем, аднак не зацьвердзіў яшчэ аднаго віду дзейнасьці — выданьня газэт. Э.Брокараў выдае газэты «Ўзгорак» ды «Горацкі выбар», а таксама рэдагуе газэту абласной кааліцыі дэмсілаў Магілёўшчыны «Выбар».

### Цацуру пазбавілі правоў

Лідэр салігорскіх прадпрымальнікаў **Аляксандар Цацура** быў выкліканы ў ДАІ, дзе яму прад'явілі афіцыйную пастанову аб пазбаўленьні правоў кіроўцы на два гады. Таксама А.Цацура мусіць сплаціць штраф памерам 350 тысяч рублёў. 10 студзеня міліцыянты затрымалі Цацуру, забралі ягоныя дакумэнты кіроўцы і абвінавацілі яго ў парушэньні правілаў дарожнага руху. 12 лютага салігорскі прадпрымальнік выйшаў на свабоду пасьля адбыцьця 15 сутак арышту за збор подпісаў пад зваротам да мясцовай улады з заклікам паспрыяць адмене прэзыдэнцкага ўказу № 760.

### Жалезьнічэнку вылучылі на Прэмію міру

Праваабарончы цэнтар «Вясна» выступіў ініцыятарам вылучэньня студэнта зь Беларусі **Зьмітра Жалезьнічэнкі** на Студэнцкую прэмію міру (Student Peace Prize). Нагадаем, увосень 2007 г. студэнт-выдатнік матэматычнага факультэту Гомельскага ўнівэрсытэту быў адлічаны. Пасьля 4 месяцаў разьбіральніцтваў, 16 студзеня 2008 г. Зьміцер быў адноўлены ў ВНУ. Але праз тыдзень яго адлічылі паўторна і забралі ў войска. На прызыўной камісіі Жалезьнічэнка заявіў, што жадае служыць у вайсковай часьці, дзе загады аддаюцца па-беларуску. Ён накіраваў заяву ў Канстытуцыйны суд з просьбай разгледзяць на адпаведнасьць Канстытуцыі палажэньні Закону «Аб агульнай вайсковай павіннасьці і вайсковай службе», згодна зь якімі ў салдатаў тэрміновай службы няма права карыстацца па ўласным выбары дзяржаўнай (беларускай) мовай.

## 13 лютага

### Маці Жалезьнічэнкі падала ў суд на «Гомельскую праўду»

**Ала Жалезьнічэнка** зьвярнулася ў суд з пазовам аб абароне гонару, годнасьці і дзелавой рэпутацыі да абласной газэты **«Гомельская правда»**. А.Жалезьнічэнка просіць суд абавязаць газэту апублікаваць абвяржэньне артыкулу «Не хачу ў салдаты, хачу ў дэмакраты» (аўтар **Ю.Чарота**), надрукаванага ў № 22, і прынесьці публічныя прабачэньні Зьм.Жалезьнічэнку і ягонай сям'і. А.Жалезьнічэнка лічыць, што інфармацыя ў артыкуле не адпавядае рэчаіснасьці і зьяўляецца галаслоўнай, выдумкай аўтара.

### Кацору асудзілі на 7 сутак арышту

Апоўдні 13 лютага ў офісе Гомельскай арганізацыі АГП адбыўсяператрус. Падставай для гэтага сталі ўлёткі, якія напярэдадні ў цэнтры гораду раздавалі мінакам актывісты дэмакратычнага руху **Ўладзімер Шумілін** і **Андрэй Аляшкевіч**. У іх было сканфіскавана каля тысячы ўлётак. Юнакі паказалі, што атрымалі ўлёткі з рук кіраўніка офісу АГП **Уладзімера Кацоры**. Улётак не знайшлі, аднак У.Кацору затрымалі і даставілі ў Савецкі РУУС, а затым і ў суд Савецкага раёну Гомеля. Затрыманых юнакоў аштрафавалі на 30 базавых велічыням кожнага.

Судзьдзя **Аляксандар Косьцікаў** прызнаў актывіста вінаватым у парушэньні закону аб парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў і прызначыў пакараньне — 7 сутак арышту.

### Сьцяг над Віцебскам у гонар Касьцюшкі

50 хвілін правісеў бел-чырвона-белы сьцяг на даху аднаго зь віцебскіх пяціпавярхоўкаў. Паводле дэмакратычнага актывіста **Барыса Хамайды**, да сьцяга была прымацаваная запіска: «У гонар хвалебнага літвіна, сына беларускага народу, нацыянальнага героя нашай Бацькаўшчыны Андрэя Тадэвуша Банавэнтуры Касьцюшкі. Мы перамагам! Мірон».

## 14 лютага

### Андрэя Кіма пакінулі ў СІЗА

Суд Цэнтральнага раёну Менску пакінуў бязь зьменаў меру стрыманьня актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Ініцыятыва» **Андрэю Кіму**. Ад 21 студзеня ён знаходзіцца ў менскім сьледчым ізалятары.

А.Кім адседзеў 10 сутак арышту за ўдзел у дэманстрацыі пратэсту супраць палітыкі ўладаў у дачыненьні да дробнага бізнэсу. За той час супраць яго пачалі крымінальную справу, абвінавацiўшы паводле арт. 364 КК РБ («Гвалт альбо пагроза гвалту ў адносінах да работніка міліцыі»). Нібыта А.Кім падчас дэманстрацыі ўдарыў супрацоўніка ДАІ кулаком у твар і расьсек таму брыво да крыві. Яму пагражае ад трох месяцаў да шасьці гадоў зьняволеньня.

### Міліцыя затрымала «анёлаў»

У Салігорску міліцыя затрымала моладзевых актывістаў, якія віншавалі мінакоў з Днём закаханых. Маладыя людзі замацавалі на сцэне ля Салігорскага выканкаму расьцяжку з надпісам «Мы любім Беларусь». У вобразах анёлаў і закаханага сэрца віншавалі мінакоў. **Івана Шылу**, **Хрысьціну Самойлаву**, **Андруся Тычыну**, **Рыгора Астапеню** і **Глеба Снопкіна** адвезьлі ў пастарунак, адкуль праз некалькі гадзінаў адпусьцілі без складаньня пратаколу.

### Арыштавалі Пётру Кузьняцова

Судзьдзя Цэнтральнага райсуду Гомеля **Марына Дамненка** пакарала актывіста апазыцыі Пятра Кузьняцова адміністратыўным арыштам тэрмінам на 5 сутак за распаўсюд улётак з інфармацыяй пра заплянаваную на наступны дзень сустрэчу выбарцаў з дэпутатам **А.Шаўко** і **Аляксандрам Мілінкевічам**. Гомельскія мясцовыя ўлады адмовілі заяўнікам у правядзеньні сустрэчы, аднак ва ўлётках было сказана, што сустрэча ўсё адно адбудзецца каля будынку ЖЭСу.

## 16 лютага

### Затрыманьні пад мурамі Валадаркі

А 19-й пад сьценамі СІЗА сабраліся салідарныя з **Андрэем Кімам**, які цяпер там знаходзіцца. Моладзь запаліла сьвечкі і выставіла зь іх на ходніку надпіс «КІМ». Супрацоўнікі ў цывільным, якія адмовіліся прадставіцца і паказаць дакумэнты, затрымалі **Валянціна Сакалоўскага** і **Аляксея Бондара** і адвезьлі іх у РУУС Цэнтральнага раёну. Затрыманых пасьля 22-й адпусьцілі без складаньня пратаколаў.

**СП**




**Больш за сорак хлопцаў і дзяўчат прыйшлі да будынку ААН у Нью-Ёрку, каб патрабаваць ад уладаў Беларусі спыніць перасьлед маладафронтаўцаў. А таксама выказаць падтрымку ўсім, хто змагаецца за дэмакратыю ў Беларусі.**

# Чаму я не хачу пісаць пра выбары ў ЗША

Усенароднае абмеркаваньне амэрыканскіх кандыдатаў на прэзыдэнты ў краінах, далёкіх ад дэмакратыі, нагадвае спрэчкі ў палаце пэўнай мэдычнай установы. Піша **Віталь Тарас**.

5-га лютага на штат Тэнэсі ды некаторыя іншыя, дзе адбываліся прэзыдэнцкія «прадвыбары», абрынуліся тарнада. Ахвярамі стыхійнага бедства сталі некалькі дзясяткаў чалавек.

Для журналістаў савецкай эпохі гэта сталася б сапраўднай знаходкай. Так і бачыш загалоўкі тагачасных вядучых газэт. «Правда»: «ВЫБАРЫ» ПАДЧАС ЧУМЫ. Ад амэрыканскага народу хаваюць праўду пра ахвяры «Тарнада»* за фальшывымі вынікамі так званых праймэрыз». «Известия»: «ВІХУРА Ў ШКЛЯНЦЫ ВАДЫ. У ЗША падлічваюць галасы «выбарцаў», а таксама колькасьць забітых у Тэнэсі і ў Іраку». «Советская Белоруссия»: «КРАХ АМЭРЫКАНСКАЙ ЭКАНОМІКІ. Нам чужыя «каштоўнасьці» іхнай «дэмакратыі». (Перадавы артыкул за подпісам Кэці Кэйк, сябра кампартыі ЗША, амэрыканскай фэміністкі).

У Беларусі і ў Расеі выйгрышнай тэмай тарнада, якія сымбалізуюць сабой будучыя палітычныя пэртурбацыі й нестабільнасьць у ЗША, пакарысталіся, вядома, ня ўсе журналісты. Толькі праз аднаго.

Іхныя калегі ў ЗША нават не зразумелі, якое шчасьце ім прываліла. На другі дзень пасьля «супэрпупэраўторка» (гэты выраз прыдумалі, дарэчы, амэрыканскія журналісты) «Сі-Эн-Эн» ад раніцы ў навінах спачатку давала «брэйкінг-ньюз» пра тарнада і чалавечыя ахвяры. А потым ужо — пра вынікі першасных выбараў. Катлеты, прабачце за цынізм, асобна, мухі — асобна. То бок, выбары ідуць у разьдзеле «палітыка». А стыхійнае бедства — у разьдзелах «здарэньні» і «надвор'е». Такія вось яны дзіўныя, гэтыя амэрыканцы.

У савецкую эпоху прэзыдэнцкія выбары ў ЗША былі сапраўды залатым часам. Асабліва для штатных камэнтатараў. Для іх гэта была дадатковая магчымасьць паехаць у камандзіроўку ў ЗШУ, у самае логвішча загніваючага капіталізму. Для гледачоў — рэдкую магчымасьць сачыць за прэзыдэнцкай гонкай (за адсутнасьцю падобнага відовішча ў СССР) і даведвацца пра розныя скандальныя падрабязнасьці з жыцьця амэрыканскіх палітыкаў, іхных сваякоў, жонак і палюбоўніц. Так бы мовіць, тагачасны варыянт сьвецкай тэлехронікі кшталту «Вы не паверыце» альбо «Міжнародная панарама».

Але ж цяперашнія пасьлядоўнікі паліткамэнтатараў тае залатой пары былі спрэс занятыя тэмай пераемніцтва ў Расеі, і таму спачатку млява рэагавалі на выбарчую кампанію ў ЗША. У расейцаў, маўляў, уласная годнасьць. Што да магчымых вынікаў тамтэйшай выбарчай кампаніі, дык сучасныя камэнтатары вынесьлі былі аднадушны вэрдыкт: нецікава, бо вынік загадзя вядомы. Пераемнікам Буша-малодшага будзе Клінтан. (Дакладней сказаць — пераемніцай, бо завуць яе Хілары і яна жонка былога прэзыдэнта Біла Клінтана.) Хоць яна і дэмакратка, адрозна ад рэспубліканца Буша, але якая розьніца? Што дэмакраты, што рэспубліканцы — выбару ж няма. А ў стане рэспубліканцаў дык і выбіраць няма з каго. Маккейн? Гэта той, што насьмеліўся крытыкаваць нашага… (можаце ўставіць прозьвішча аднаго з кіраўнікоў саюзнай дзяржавы ў залежнасьці ад свайго грамадзянства)? Яму ж 71 год! Ён жа палітычны труп, стары рыдван. Ня тое што Зубкоў, якія ў свае 70 мужчына хоць куды…

Сачыць за прэзыдэнцкімі выбарамі ў Расеі, якія адбудуцца на восем месяцаў раней за амэрыканскія, куды цікавей. Паводле вызначэньня. Бо на фінішы выбарнай гонкі ў ЗША застануцца, хутчэй за ўсё, толькі два кандыдаты (калі ў барацьбу рэспубліканцаў і дэмакратаў ня ўступіць які незалежны кандыдат). А ў Расеі — ажно чатыры. Выбірай на любы густ: пераемнік, камуніст, масон, сын юрыста.

Толькі вось за адсутнасьцю дэбатаў і ўвогуле чагосьці падобнага да спаборніцтва ў апошнія восем—дзесяць гадоў публіка ў эўрапейскай частцы былога СССР стала зь цікаўнасьцю паглядваць на заакіянскае выбарчае шоў. Там і карцінка ярчэйшая, за кошт зорна-пасяястых сьцягоў, і прамоўцы гавораць нешта бадзёрае і як быццам нават асэнсаванае, і твары ў іх нейкія інтэлігентныя. І ўвогуле — інтрыга. То адзін выйдзе наперад, то другі, то нехта здымецца з гонкі. А трэці, якога ўжо сьпісалі ў аўтсайдэры, раптам перамагае ў некалькіх штатах запар. Усё паводле законаў галівудзкага кіно.

Быў такі анэкдот. Памёр савецкі грамадзянін, і вось яму прапануюць на выбар рай альбо пекла. А паглядзець сьпярша можна? — Можна. Паглядзеў ён на рай — там чыста, сьветла, але пуста, толькі цені нейкія бадзяюцца туды-сюды. Сумна. Пагглядзеў на пекла — хмарачосы, шыкоўныя аўтамабілі, бляндынкі ў бікіні на пляжы, віскі з содавай… Ну, і выбраў… А там — катлы са смалой і д'яблы ўсьміхаюцца. Гэта ж рэкляма была, а ты паверыў.

Вось і нашыя камэнтатары, не разгледзеўшы за яркай абгорткай гнілога зьместу, паддаліся ўсе як адзін на гэтую рэклямную вуду, гэтую падманку і пачалі ў захапленьні камэнтаваць амэрыканскія выбары. Цяпер ужо ніводная дэталь ня высьлізьне з-пад іхнай пільнай увагі. І як Хілары пусьціла сьлязу, і якія кашулі любіць насіць Абама, і як Маккейна нейкія вэтэраны зьвілі на падмане. («Ну, ня мог ён быць у віетнамскім палоне — выдумаў усё ад пачатку да канца, каб прынізіць вобраз амэрыканскага афіцэра і абяліць ворага». Вам гэта нічога не нагадвае?) І што ў стане рэспубліканцаў раскол. Для кансэрватараў, бачце, Маккейн занадта лібэральны. І некаторыя зь іх гатовыя, хутчэй, галасаваць за Клінтан, чым за Маккейна. А можа быць, за Абаму? Не разабрацца — дзе там Дэмакратычная партыя, а дзе Рэспубліканская. Ім бы наш Мін'юст. Ён бы хутка ўсе партыі расставіў па сваіх месцах. Ды й ня

---

* «Тарнада» — зьнішчальнік–бамбавальнік сярэдняга радыюсу дзеяньня. Знаходзіцца на ўзбраеньні ВПС Вялікабрытаніі і Нямеччыны, якія ўваходзяць у агрэсіўны блёк НАТО. Выкарыстоўваўся пры бамбаваньні мірных аб'ектаў у Іраку. (Заўвага рэд. умоўн. газ. «Правда» — В.Т.)

толькі Мін'юст мог бы дапамагчы.

Цікавая рэч нядаўна адбылася. Аўтарытэтны тэлевядоўца, прэзыдэнт расейскай тэлеакадэміі, знаўца амэрыканскага жыцьця Ўладзімер Позьнер заявіў на радыё, што амэрыканцы ня любяць назіральнікаў на сваіх выбарах і ніколі іх не запрашаюць. Не каб параіцца зь беларускім сэнатарам Чаргінцом, які езьдзіў у ЗША акурат назіральнікам. Тады не патрапіў бы Позьнер у сьмешнае становішча, і амэрыканскае пасольства ў Маскве ня стала б публікаваць абвяржэньне, у якім гаворыцца, што назіральнікі ад АБСЭ прыяжджалі ў ЗША і на прэзыдэнцкія выбары 2004-га, і на прамежкавыя выбары ў кангрэс у 2006-м. Ну, гэта так — дэталі. Хоць у іх, кажуць, хаваецца д'ябал.

Ніяк не даецца камэнтатарам ісьціна ў рукі — хто ж стане гаспадаром (гаспадыняй) Белага дому і чаго ў залежнасьці ад гэтага чакаць постсавецкім краінам? Усё праймэрыз і праймэрыз, ды яшчэ кокусы нейкія. Проста дзікуны. Нездарма «кокус» (па нашаму —галасаваньне на партыйных сходах) паходзіць ад індзейскага слова, якое азначае выбары правадыра племені. Даўно ўжо ўсяму сьвету зразумела, што ад галасоў выбарцаў нічога не залежыць, што ніякай дэмакратыі, акрамя сувэрэннай, няма і быць ня можа. А наіўныя амэрыканцы ўсё галасуюць і галасуюць. У чэргі выстройваюцца падчас праймэрыз. Дзе ж такое можна ўбачыць, акрамя адсталай Афрыкі? Дык там і скрыні празрыстыя. Ня тое што ў Беларусі.

І што самае неверагоднае — тая самая Амэрыка, якая ўсім так надакучыла і абрыдла ва ўсім сьвеце сваёй дэмакратыяй, цікавіць абываталя ў краінах, кіраўніцтва якіх Амэрыку на дух не выносіць. А ў некаторых нават пагражаюць выслаць пасла ЗША, калі яна не перастане назаляць сваёй актыўнасьцю. Тым ня менш, і ў нас штатныя камэнтатары вымушаныя ўнікліва камэнтаваць амэрыканскую выбарчую кампанію, бо няма больш папулярнай тэмы сярод простага народу.

Адна з галоўных навінаў апошняга часу на гэтую тэму— прадказаньне папулярнага астроляга. (Ня буду называць лішні раз ягонае імя, каб не рабіць рэкляму.) Чарговым, 44-м прэзыдэнтам ЗША стане жанчына. А паколькі лічба 44 для штатаў чамусьці нешчасьлівая, дык давядзе гэтая жанчына амэрыканскую эканоміку да ручкі. Скончыцца на гэтым амэрыканская імпэрыя і ўвогуле гісторыя ЗША. Пачнецца масавае беспрацоўе. Мільёны галодных і абарваных амэрыканскіх жабракоў хлынуць у Расею і Беларусь, дзе рабочых рук ва ўмовах пад'ёму эканомікі акурат не хапае.

А чаго вы хацелі? Баба на чале сям'і альбо дзяржавы — такое да дабра не давядзе.

Але гэта яшчэ што! Гавораць, што прэзыдэнтам ЗША можа стаць чарна… Ну, афраамэрыканец. Негр, адным словам. (Хоць для некаторых афраамэрыканцаў у ЗША Абама, кажуць, мае недастаткова цёмную скуру.) А нэгры, як вядома, заўсёды былі сябрамі СССР. Значыць, гэты кандыдат — наш, левы. Адзін вядомы камэнтатар задаўся пытаньнем: а што калі здарыцца глябальны канфлікт, і прэзыдэнт ЗША апынецца перад выбарам — націскаць ядзерную кнопку, ці не? І тут нашчадак Марціна Лютэра Кінга ўспомніць пра белых плянтатараў і хібару дзядзькі Тома. І рука прэзыдэнта ў апошні момант апусьціцца. І сьвет пазьбегне атамнага апакаліпсісу... Ну, прынамсі, лепшая палова сьвету.

А іншыя кажуць: Маккейн — наш кандыдат! Наш-наш! Пачакайце, ён пакажа нашаму тырану, як правы чалавека парушаць. І наогул ягоныя продкі родам з-пад Пухавічаў. Вы ня ведалі? У іх жа прозьвішча было Макавік. Ці Мікуліч. Вунь як добра тыя Мікулічы (Магаўлічы) граюць у хакей за клюбы НХЛ. Так што — усе на выбары ў палату прадстаўнікоў! Галасуем за Маккейна!

Усенароднае абмеркаваньне амэрыканскіх кандыдатаў на прэзыдэнты ў краінах, далёкіх ад дэмакратыі, нагадвае спрэчкі ў палаце пэўнай мэдычнай установы. А з другога боку, што яшчэ абмяркоўваць? «Выбары» прэзыдэнта суседняй дзяржавы? Дык мы ягонае імя ўжо ведаем. Восеньскія выбары ў Беларусі ў ніжнюю палату? Дык ужо апазыцыя вылучыла ўсіх сваіх дэмакратычных кандыдатаў. І ўсе загадзя ведаюць, што яны ня пройдуць.

За адсутнасьцю ўласнага палітычнага жыцьця і выбару будзем сачыць за выбарамі ў ЗША і хварэць за чужых кандыдатаў.

Але я ў гэтым вар'яцтве ня ўдзельнічаю. І пісаць пра іхныя выбары не хачу.

Хаця, раскрыю вам сакрэт, я таксама за Маккейна.



PHOTO.BYMEDIA.NET


PHOTO.BYMEDIA.NET

**«Рамантычны канцэрт» «Крамбамбулі» на Дзень сьвятога Валянціна прайшоў зь неверагодным аншлягам.**

# Беларуская музыка ў Пецярбургу

Нельга сказаць, што наша эпоха прайшла пад музыку Мацыеўскага. Але эпоха была акурат такая, як музыка Мацыеўскага: часам рваная, няроўная, з фарсажамі, часам сьмяшлівая, з рознымі інструмэнтамі. Традыцыі клясыкі ў спалучэньні з авангардам. Тут і сола на віялянчэлі, і скрыпка з фартэпіяна, і проста фартэпіяна і вакал — мужчынскі і жаночы, і бурлеска для трубы і фартэпіяна, і сола на арфе... папольску, па-расейску, па-беларуску. Па-польску з расейскім акцэнтам (бо выканаўцы расейскія), па-беларуску — з тым жа акцэнтам з той жа прычыны. Аўтарскі вечар кампазытара 12 лютага ў Малой залі імя Міхаіла Глінкі Акадэмічнай філярмоніі пачынаўся чытаньнем Адама Міцкевіча і Палянэзам, а заканчваўся бліскучай прэм’ерай трох частак «Месы» па-беларуску ў выкананьні камэрнага хору «Росіка» пад кіраўніцтвам Валянціны Капыловай—Панчанка.

Ігар Мацыеўскі скончыў Львоўскую і Ленінградзкую кансэрваторыі. Ён ня толькі кампазытар, але і вучоны-музыказнаўца. Гэты выдатны музыкант шматкроць зьвяртаўся ў сваёй творчасьці да беларускіх матываў, тэкстаў беларускіх паэтаў (найперш Багдановіча). Разам з жонкай Галінай Таўлай, дачкой вядомага заходнебеларускага паэта, ён уважліва вывучае музычныя асаблівасьці памежжа: беларуска-расейскага на Невельшчыне і Смаленшчыне, беларуска-польскага на Беласточчыне. Некалькі гадоў таму ў пецярбурскім выдавецтве «Вольная Беларусь» выйшаў зборнік музычных твораў Ігара Мацыеўскага на словы беларускіх паэтаў.

**МН**

## СЬЦІСЛА

### Па-беларуску выйшаў «Тарзан-2»

Згуртаваньне «Дзіўноты й памароцтвы» агучыла па-беларуску мультфільм «Тарзан-2». Ён будзе дэманстравацца 23—24 лютага і 1—2 сакавіка ў відэазалі на 4-м паверсе цэнтральнага чыгуначнага вакзалу (дзіцячая гульнявая пляцоўка).

### Мазырцы змагаюцца за будынак

Грамадзкасць Мазыру дабіваецца наданьня статусу гістарычна-культурнай каштоўнасьці адзінаму ў горадзе будынку ў стылі мадэрн. Адтуль выселеныя жыхары, ходзяць чуткі, што ўлады зьбіраюцца зьнесьці будынак.

**Паводле БелаПАН, Польскага радыё для замежжа**

## Ляховіч баксіраваў з Валуевым адной рукой



У суботу ў Нюрнбэргу прайшоў баксэрскі бой між беларусам Сяргеем Ляховічам і расейцам Мікалаем Валуевым. Яны вызначалі афіцыйнага прэтэндэнта на чэмпіёнскі пояс паводле вэрсіі Сусьветнай асацыяцыі боксу. На жаль, роўны бой не атрымаўся. «Расейскі велікан» упэўнена кантраляваў ходу паядынку. Перамогу Валуеву аддалі ўсе судзьдзі.

Падчас трансьляцыі было бачна, што Ляховіч фактычна не працуе правай рукой. Пасьля бою «Белы воўк» прызнаўся, што два тыдні таму траўміраваў руку: «Дзікі боль не дазваляў паўнавартасна баксіраваць».

Можна лічыць нават подзьвігам, што беларус вытрымаў цэлы бой супраць Валуева, не саступіўшы накаўтам. Цяпер Ляховіч зьбіраецца залячыць траўмы і вярнуцца на рынг.

### Настаўнік як стоп-сыгнал

На Гарадзеншчыне побач з школамі настаўнікі і старшаклясьнікі ў зыркіх камізэльках будуць дапамагаць дзецям пераходзіць нерэгуляваныя пераходы на дарозе да навучальнай установы. Падобная практыка праводзіцца і ў суседняй Польшчы. На дзяжурства плянуецца заступаць а палове восьмай раніцы, там, дзе вучацца ў другую зьмену, людзі з жазламі зьявяцца і ў абед. Навіну ўвядуць па ўсей Гарадзенскай вобласьці.

### Шаша Берасьце—Менск будзе платнай для ўсіх

Цяпер за карыстаньне трасай плацяць толькі кіроўцы-замежнікі і беларускія ўладальнікі вялікагрузных аўтамабіляў. Тарыф, які бярэцца з машын, пакрывае толькі 30 % выдаткаў на рамонт і ўтрыманьне трасы. Ад 2009 г. кошт праезду для беларускіх уладальнікаў легкавікоў складзе ня больш за 2 тыс. рублёў.

### Хатнія кампутарныя сеткі будуць ліквідаваныя да ліпеня

Да ліпеня 2008 ў Менску плянуецца ліквідаваць усе незаконна створаныя кампутарныя сеткі ў жылых дамах. Адміністратарам сетак будуць выдавацца прадпісанні на добраахвотны дэмантаж гэтага абсталявання.

### Рэкляма на яйках

У Мінсельгасхарчы разглядаюцца прапановы з рэгіёнаў пра разьмяшчэньне на курыных яйках каляровай рэклямы. Пра пэрспэктыўнасьць гэтых намераў гаворыць расейская практыка. Першыя агітацыйныя яйкі зьявіліся ўжо на мінулым тыдні ў Благавешчанску. Адзін з аўтараў ідэі — сябра партыі «Единая Россия» Сяргей Барысаў. Ён — дырэктар птушкафабрыкі. Яйкі прадпрыемства ўпрыгожаныя чырвоным надпісам «За Барысава». У ЗША на 35 мільёнах яек будзе красавацца лягатып тэлеканалу CBS і надпісы тыпу «CSI: Crack the Case on CBS» (рэкляма «Дасьледаваньне зь месца злачынства»).

### Беларускі эмігрант выйграў мільёны ў амэрыканскай лятарэі

Мільённы выйгрыш Lotto jackpot дастанецца двум нью-ёрскім эмігрантам. Гэта 50-гадовы беларус Алег Салаўёў з Брукліну і 54-гадовы пэруанец Пабла Магалон з Манхэтэну.

### Рог апошняга тура — у швэдзкім Арсэнале

У Швэцыю прыехала дэлегацыя ад гістарычнага клюбу «Гусарская харугва Яна Казлоўскага», маршалка Паморскага ваяводзтва. Дэлегаты абвясьцілі пасланьне да Карла XVI з просьбай вярнуць частку польскіх трафэяў, вывезеных швэдамі падчас вайны з Рэччу Паспалітай. Нагодай да паездкі ў Швэцыю стала выстава «Ваенныя трафэі» ў Стакгольмскім каралеўскім арсэнале. Сярод каштоўнасьцяў фігуруюць рог апошняга беларускага тура ў срэбнай аправе, каштоўныя іконы і чашы зь беларускіх і польскіх касьцёлаў.

### Амэрыканскі спадарожнік можа зваліцца на Беларусь

Амэрыканцы ўдакладнілі, што пагроза датычыць тэрыторыі, якая ляжыць ніжэй за 52 паралель, гэта значыць лініі, якая праходзіць праз Берасьце.

У зоне рызыкі знаходзяцца ўсе краіны, што ляжаць між 58,5 градуса паўночнай і 58,5 паўднёвай шыраты.

Шпіёнскі спадарожнік вагою ў дзьве тоны сыходзіць з арбіты. На яго борце — паўтоны высокатаксычнага ракетнага паліва. Тым, хто знойдзе абломкі, раяць не набліжацца да іх, а тэлефанаваць у ратаўнічыя службы.

### Эстонская інтэрнэт-крама прадала танк

За савецкі танк Т-55 1970 году вытворчасьці пакупнік заплаціў 70 тыс. эўра. Пра папярэдняга ўласьніка вядома мала. Ведама толькі, што гэта расейскамоўны прадпрымальнік з Латвіі. Танк знаходзіцца ў Рызе і зарэгістраваны як трактарная тэхніка. Машына захавалася «ў арыгінальным стане», праўда, не страляе.

**АК, Зьміцер Панкавец, ЯС, радыё «Свабода», БЕЛТА, БелаПАН, «Вечерний Гродно», СТВ, belnarod.org**



Юлія Дарашкевіч

# Акцыя любові

З абыходу пасольстваў на Дзень сьвятога Валянціна робіцца прыгожая традыцыя.

Напярэдадні традыцыйнай моладзевай акцыі амаль не было ніякіх улётак і налепак, якія б заклікалі людзей 14 лютага прыйсьці на пляц Свабоды а 17-й. Мо таму ў прызначаны час на месцы было ўсяго некалькі дзясяткаў актывістаў. Побач з ратушай тулілася прыкладна такая самая колькасьць «ціхароў» з камэрамі.

З старэйшых палітыкаў акцыю наведаў толькі Аляксандар Мілінкевіч. Сьледам на плошчы зьявіліся нядаўнія палітвязьні — Зьміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч, абодва ў гарнітурах і пры гальштуках. Яны пачалі раздаваць павязкі «Я люблю Беларусь». Нейкі хлопец прынёс жмут белых і чырвоных балёнікаў і таксама раздаваў.

Акцыя пачалася, калі з Катэдральнага касьцёлу выйшлі чатыры дзяўчыны, апранутыя ва ўжо традыцыйныя белыя анёльскія строі зь вялікім чырвоным сэрцам на грудзях. Дзяўчаты несьлі нацыянальны сьцяг. Пакрысе і на пляцы пачалі ўздымацца яшчэ і яшчэ сьцягі. Запаліліся бэнгальскія агеньчыкі. Міліцыянты назіралі за ўсім гэтым абсалютна спакойна.

Калёна рушыла да францускай амбасады, якая месьціцца акурат на пляцы Волі. У будынак пайшлі Зьміцер Дашкевіч, Наста Палажанка, Таццяна Шапуцька і Кася Галіцкая. Іншыя засталіся на вуліцы. Тым часам невялікую прамову сказаў А.Мілінкевіч: «Цудоўнае сьвята, цудоўны дзень. Чалавек, які кахае, — сьветлы, прыгожы, ён жыве даўжэй. Я хачу, каб вы захавалі на ўсё жыцьцё гэтае шчасьце Божае — кахаць і быць каханымі. А яшчэ зычу ўсім ніколі ня страчваць любові да Бацькаўшчыны».

У пасольстве «маладафронтаўскую» дэлегацыю прымала асабіста спадарыня Мірэй Мюсо, што заўважна кантраставала зь мінулымі гадамі.

Калёна тым часам скіравалася ў бок вуліцы Маркса. У гэты час раптоўна пачаўся вялізны сьнегапад, амаль такі самы, як 19 сакавіка 2006 г. Шэсьце пад сьнегам, дзяўчыны-анёлы, бел-чырвона-белыя сьцягі выглядалі вельмі эфэктна.

Была думка, што ўдзельнікі акцыі пройдуць пад вокнамі будынку Адміністрацыі прэзыдэнта, але ў апошні момант яны збочылі на Кастрычніцкую. У любым выпадку, так блізка зь бел-чырвона-белымі сьцягамі да Адміністрацыі ўжо даўно ніхто не падыходзіў.

Падчас шэсьця да плошчы Перамогі дэманстранты гукалі «Бог дапаможа, і мы пераможам», «Свабоду палітвязьням», а таксама сьпявалі «Пагоню» і «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Ля польскага пасольства, што на вул.Румянцава, віншаваньні прымалі 2-і сакратар Марыюш Краеўскі і прэс-аташэ Моніка Садкоўская.

Апошнім пунктам праграмы была амэрыканская амбасада. Калі дэманстранты павярталі да Сьвіслачы, побач з домікам 1-га зьезду РСДРП езьдзіў аўтазак. Нікога затрымліваць ня сталі, хаця ў калёне ішло дастаткова шмат пераапранутых у цывільнае амонаўцаў.

Ад пасольства ЗША да моладзі выйшаў першы сакратар Луіс Крышак, які па-беларуску прамовіў: «Віншую вас з Днём сьвятога Валянціна». Дыплямат частаваў моладзь цукеркамі. Зьміцер Дашкевіч у размове са сп.Крышакам зьвярнуў увагу на праблему палітвязьняў.

На гэтым акцыя і скончылася. Яна не была вельмі шматлікай, але і не выбівалася з шэрагаў падобных мерапрыемстваў мінулых гадоў. Традыцыйны такі Дзень сьвятога Валянціна.

**Зьміцер Панкавец**

# Вялікі дзякуй за падтрымку

**Антону Т.** з Смалявіцкага раёну.
**Андрэю Г.**, **Міхасю Н.** з Наваполацку.
**Леакадзіі Н.** з Валожынскага раёну.
**Людміле М.** з Горадні.
**Сяргею А.** з Клімавіцкага раёну.
**Але А.** з Магілёва.
**Аляксандру П.** са Жлобінскага раёну.
**Анатолю К.** зь Любанскага раёну.
**Георгію С.** з Воршы.
**Мікалаю Х.** са Шчучынскага раёну.
**Руслану Р.**, **Вячаславу С.** з Баранавічаў.
**Андрэю Ч.** з Рагачоўскага раёну.
**А.Р.**, **Канстанціну К.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**Сьвятлане Ц.** з Маладэчна.
**В.Ю.** з Салігорску.
**Барысу М.**, **Андрэю С.**, **Ігару Б.**, **Уладзімеру Л.**, **А.К.**, **Рыце М.**, **А.Ш.**, **Андрэю Л.**, **А.Р.**, **Рыгору Г.**, **Міхаілу Ш.**, **Ю.Ф.**, **Людміле Б.**, **Кірылу М.**, **Ігару Г.**, **С.К.**, **Максіму Ц.**, **Лідзіі П.**, **Ніне К.** зь Менску.

**Франц Сіўко. Дзень Бубна.** — Менск: Логвінаў, 2008. — 276 с.




Замаўляйце кнігі сэрыі

«Кнігарня «Наша Ніва»

праз т.:
**(029) 505-39-11,**
**(029) 126-36-87**

або праз e-mail:
**knihi@me.by**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

**ВОДГУК**

## Людміла Карпенка: Ёсьць людзі, якія не баяцца

**Я вырашыла адгукнуцца на зацемку «Гонар за горад, дзе жыву» («НН» №42'2007) і падзякаваць за памяць і водгукі пра майго мужа Генадзя Карпенку.** Чалавечая памяць кароткая. Калі забываюць сябры, людзі, якім ён дапамог у жыцьці, дык што казаць пра іншых. Вы жывяце ў краіне дыктатуры «лукашызму», у сетках чалавечага страху за сваё жыцьцё, за жыцьцё сваіх блізкіх. Нават праз восем гадоў там баяцца вымаўляць імя Карпенкі. Чаму? Таму што быў страшны, небясьпечны для кіраўніцтва краіны. Гэта я адчуваю і цяпер, людзі баяцца са мной размаўляць, патэлефанаваць, пагутарыць, а мае лісты калі і даходзяць, то абавязкова адкрытыя. Але ёсьць і іншыя людзі, іх мала, але яны ёсьць.

Я не магу прыехаць, схадзіць на магілу свайго мужа, сваіх бацькоў, але ёсьць людзі, якія наведваюць іх, прыносяць кветкі. Я ведаю, ёсьць людзі, у якіх стаяць партрэты Карпенкі. Ёсьць людзі, якія, нягледзячы ні на што, пішуць мне, перадаюць артыкулы і нават маленькія падарункі.

Сёлета споўнілася дваццаць гадоў партнэрскіх сувязяў гарадоў-пабрацімаў — гораду Маладэчна і гораду Есьлінген у Нямеччыне. Я была запрошаная на ганаровы вечар. І мэр гораду Есьлінген прысьвяціў большую частку свайго выступу таму ўнёску, які зрабіў Карпенка ў партнэрскія дачыненьні. А на Радзіме? У родным Маладэчне? Бо ж для яго Маладэчна быў другой радзімай, а людзі з Маладэчна — самымі роднымі, ён ім дапамагаў, нават калі ўжо ня быў мэрам. Вы ганарыцеся горадам, у якім зьмененыя вуліцы ім, Карпенкам. А чаму ж няма вуліцы імя Карпенкі?

**Людміла Карпенка, Эсьлінген (Нямеччына)**




## Вымушаная беларусізацыя

**Яшчэ пару гадоў таму, на ўскрайку Глыбокага, збоч людната гасьцінцу Полацак—Вільня, існавала мінікавярня «Сыты Хома», якая месьцілася ў звычайным драўляным вагончыку. Гаспадар потым прадаў гэты аб'ект грамадзкага харчаваньня і зьехаў у Полацак.** Так паўстаў новы шынок пад назовам «Гарб». І, насамрэч, — гара. Тут найвышэйшы пункт, а долу, нібы ў кратэры вулкана, — Глыбокае.

Гаспадар узьвёў новы прыстойны будынак ды паехаў да Алеся, майго знаёмца, замаўляць шыльду. Шыльду, зразумела, уладальнік шынка замовіў на правільнай мове: «Мини-кафе «Гора».

Алесь кажа шынкару: «Рабіў бы ты, дзядзька, адразу шыльду на беларускай. Наш народ такі: прачытае адэкватна — «Гура». Але ж дзе ты ў бізнэсе паспрачаесься: плоцяць — рабі! І зрабіў… Чутка пра «Гура» пайшла далёка. Што ні кажы: ускраіна Глыбокага — далёка ад пільнага вока грамадзтва. Свавольна, да позьняй ночы, адчувалі сябе тут розныя маладзёны. Сапраўды, гора, калі малады муж, пакінуўшы жонку зь немаўлём у хаце, процьму часу бавіць зь пекнымі дзеўкамі ў «Горы», а сам, яшчэ год таму, перад шлюбам, кляўся ў вечнай вернасьці. І колькі б тое «Гора» магло зруйнаваць маладых сем'яў?

Прароцтва спраўдзілася. Не прайшло шмат часу перад тым, як шынкар прыехаў замаўляць новую шыльду, на беларускай мове: «Міні-кафэ «Гара». «Гора» забылася, засталася «Гара».

**Уладзімер Скрабатун, Глыбокае**

## Імпэрыялістычны праект

**Газэта «Полацкі веснік» (№6'2008) надрукавала артыкул «Аднаўляючы гісторыю».** Артыкул прысьвечаны плянам па аднаўленьні помніка ў гонар перамогі імпэрскае Расеі над імпэрскай Францыяй у вайне 1812 г.

Помнікі, падобныя да згаданага, расейскія акупанты ставілі й на іншых захопленых тэрыторыях, каб паказаць межы Расейскае імпэрыі. Гэта быў звычайны «тыповы праект», згодна з сучаснаю тэрміналёгіяй. Помнік у акупаваным Полацку расейцы паставілі яшчэ ў 1850-м, не пытаючыся дазволу ў мясцовых жыхароў.

Для тых жа людзей, што жылі ў той час у Полацку, як расейцы, гэтак і французы былі заваёўнікамі ды акупантамі.

У Расеі пасьля развалу СССР пануюць вельмі моцныя рэваншысцкія настроі. Нездарма адным з заказчыкаў выступае расейская ваеншчына, якая й фінансуе згаданы праект. Гістарычны досьвед дае шмат прыкладаў таго, што, калі «аднаўляць гісторыю» бяруцца людзі з адпаведных органаў, заўсёды нараджаецца пачвара. Вось такую пачвару, з дзьвюхгаловымі арламі, прапануюць палачанам заказчыкі зь беларускага ды расейскага боку.

**Уладзімер Губскі, палачанін**

## Скажы мне, што ты распаўсюджваеш...

**Я зьвярнуўся ў Адміністрацыю прэзыдэнта з пытаньнем, чаму ў нас распаўсюджваецца чарнасоценная газэта «Русский вестник», а нацыянальныя дэмакратычныя выданьні забароненыя для распаўсюджваньня.** Ці гэта не падвойныя стандарты? Атрымаў адказ зь Міністэрства інфармацыі і дасылаю яго Вам. Мяркуйце самі, за каго трымаюць нас чыноўнікі. Л.Ананіч, відаць, робіць выгляд, што ня ведае, як у адзін момант, адначасова, усе выданьні, якія пішуць ня тое, што хоча ўлада, былі выкінутыя зь «Белпошты», «Белсаюздруку». А з адказу выходзіць, што «ніхто ня мае права прымусіць заключыць або разарваць дамову на распаўсюд пэрыядычных выданьняў». Я сабраў цэлую тэчку адказаў розных судоў, якія ў адзін час даказвалі, што ў нас усё паводле закону. Узгадваю словы Салжаніцына: «Як цяля з дубам бадалася»… А прэзыдэнт «шчыра» абураецца: «Чаго хоча ад нас Захад?»

**Лявон, Гомель**



МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО ИНФОРМАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Праспект Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск тэл. (017) 203 92 31, факс (017) 203 34 35

Проспект Победителей, 11, 220004, г. Минск тел. (017) 203 92 31, факс (017) 203 34 35

«29» 01 2008 № 02-14/25ДС

на № ..........

О рассмотрении обращения

Министерством информации рассмотрено Ваше обращение, поступившее из Администрации Президента Республики Беларусь, по поводу распространения в Республике Беларусь газеты «Русский вестник».

Газета «Русский вестник» издается с 1991 г., зарегистрирована за номером 012114 в Мининформпечати Российской Федерации, периодичность выхода – 2 раза в месяц.

В числе распространителей издания в Республике Беларусь – организации «Союзпечать», РУП «Белпочта», а также ЗАО «Христианская инициатива». Указанные предприятия распространяют газету «Русский вестник» на основании заключенных договоров с редакциями и агентствами. Законодательством Республики Беларусь установлен принцип свободы договора, суть которого сводится к тому, что понуждение к заключению договора не допускается, поэтому никто не имеет право понудить организации заключать либо расторгать договора на распространение каких-либо периодических изданий.

В…

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by. Факс: (017) 284-73-29**

# Наша новая ідэнтычнасьць



Апошняя чвэрць стагодзьдзя зьмяніла беларусаў амаль непазнавальна. Эсэ **Сяргея Харэўскага.**

Я сачу за праявамі жыцьця. Мне цікавыя таямнічыя памяткі здавёншчыны, што зажылі сёньня сваім жыцьцём новым. Я жыву ў плыні новае культуры, супрацiўляючыся ці нырцуючы ў яе. З пункту гледжаньня культуроляга, ня гэтак істотна, на падставе (суме) якіх характарыстыкаў будуецца ўсьведамленьне этнічнае тоеснасьці. У якасьці прыкладаў, што розьняць адзін народ ад іншага, могуць быць розныя характарыстыкі: мова і гаворка, каштоўнасьці й прымхі, вера ці зьнявераньне, міты пра паходжаньне, расавая прыналежнасьць, музычная культура альбо асаблівасьці прыродна-кліматычных умоваў… І ўяўленьне пра Радзіму, у рэшце рэшт. Варта тут параўнаць хоць эскімосаў, мікранэзійцаў, расейцаў, літоўцаў ці нас. Рэестар гэткіх характарыстыкаў можна доўжыць да бясконцасьці, ажно да формы шнобэля альбо тату.

## Новая нацыя

Беларуская ідэнтычнасьць складаецца з тысячаў характарыстык, гістарычных і натуральных перадумоваў. Але за апошнія гадоў дваццаць беларусы моцна зьмяніліся. То бок беларусы, у сучасным сэнсе, у сучасных межах, зь цяперашнім адміністрацыйным падзелам ды г.д., а не «ліцьвіны», «белоруссы Смоленской губернии» ці «jakie miłe wieśniaki», і, нават, не беларусы 1970-х! Так, склалася нашая «ўстойлівая група» не магла бяз тысячы гадоў папярэдняе гісторыі. Але апошняя чвэрць стагодзьдзя зьмяніла беларусаў амаль непазнавальна. Сярод іншага — сьцёртая амаль розьніца паміж Захадам і Ўсходам, вырасла ўласная інтэлігенцыя, разваліўся калгасны лад, які ўспрымаўся адназначна пазытыўна, зьявілася рэлігійнае жыцьцё...

А ад беларускае ідэнтычнасьці 1907 году нас аддзяляе ўжо «смуга стагодзьдзяў», што засьціць нам рэальныя ўяўленьні пра нашых дзядоў-прадзедаў ды пра нас жа саміх. З нашае новае ідэнтычнасьці выпалі вялікія часткі нацыянальнае традыцыі. Напрыклад, уяўленьні пра прыроду, разам з «народным календаром» і «народнымі прыкметамі». Альбо пра пільную патрэбу ў адукацыі, якой трызьнілі беларусы на пачатку XX ст., за якое іх пераканалі, што цудоўна можна пражыць і безь яе. Абыякавы беларус ужо не лісьлівіць перад польскасьцю ці расейшчынай, але ўмудрыўся забыцца на сваё ўласнае з хуткасьцю ў паўпакаленьня. Ня маючы цяпер комплексаў перад суседзямі, ён ня мае нічога ўласнага, каб бараніць. Нішто не дае гэтульки спажывы для развагаў пра цяперашнюю ідэнтычнасьць, што лепіцца літаральна на нашых вачах, як сьвяты… А перадусім — Каляды. Напрыклад, мяркуючы па колькасьці кардонак з-пад піцы, што валяліся па дварах, можна падумаць, што гэта і ёсьць нацыянальная страва.

Засталося толькі спакаваць цацкі й павыкідаць ялінкі. Некалі жывыя й зялёныя, духмяныя й колкія, яны давалі прытулак казюркам і птахам. Нягеглым нічыйным хлудам валяюцца яны цяпер па кутах бэтонных двароў. Гэта, бадай, адна з самых неэтычных і нелягічных практыкаў, што мы запазычылі з савецкіх часоў.

## Поп-супольнасьць

Дарэчы, адтуль жа, з савецкай перабудовы, мы перанялі й кітайскі каляндар. Спачатку гэта было забаваю, знаёмствам з чужымі й незразумелымі традыцыямі. А сёньня бадай кожны ведае, ці ён Дракон ці Вогненная Сьвіньня, ды ў чым і з чым мусім сустракаць кітайскія гады з гадамі. Пры гэтым цьмяна ўяўляючы нават зьмест Бібліі. Колькі вы, асабіста, ведаеце людзей, што трывалі шчыры вялікі пост да 7 студзеня? Вось жа гэтая колькасьць і ёсьць рэальнай колькасьцю праваслаўных у нашай краіне…

Але тут цікавей далей — сярод беларусаў атэістаў і таго менш! Большасьць нашага народу хутчэй агностыкі, якія, пры тым, з забабоннай дабравейнасьцю ставяцца да царкоўных абрадаў, сэнсу якіх не разумеюць... На ўсялякі выпадак. Пры гэтым я на ўласныя вочы бачыў мноства людзей, якія абсалютна шчыра й палымяна моляцца камяням, крыніцам, дрэвам...

А якая можа быць, у прынцыпе, культурніцкая хрысьціянская ідэнтычнасьць, калі 99% не спасьціглі Пісаньня, ня ведаюць гісторыі царквы, царкоўнага календара, НЕ АБЦЯЖАРВАЮЦЬ СЯБЕ высілкамі духоўнымі, мінімальнай вучобаю, пагатоў, абавязковымі практыкамі? Але як можна вымераць, ці чалавек ёсьць хрысьціянінам? Калі ён ня ведае Сьвятога Пісаньня, гісторыі царквы, сэмантыкі абрадаў, ня

**Працяг на старонцы 20.**

# Наша новая ідэнтычнасьць

Працяг са старонкі 19.

ходзіць да прычасьця, не бярэ ўдзелу ў жыцьці супольнасьці? А на Вадохрышча было ня ўбіцца ў цэркві! Чэргі па ваду парасьцягваліся на кілямэтры! Праз тое толькі, што ён па ваду ў царкву чаргу адстаяў, ён ужо хрысьціянін? На месца ўсяго гэтага прыходзіць цемрашальства, забабоннасьць, сумнеўныя апокрыфы з танных газэтак, хірамантыя й фізіягноміка, кітайскі каляндар і гараскопы...

Этнічная ідэнтычнасьць ёсьць найбольш даступнаю формаю сацыяльнае ідэнтычнасьці, як гэта ні парадаксальна, менавіта ў нашай краіне. Атаясаміць сябе з «народам» для бальшыні беларусаў зусім не складана, бо акурат савецкая пашпартная сыстэма стварыла з панятку «нацыянальнасьць» расавую катэгорыю, якую можна вызначыць па этнічных генах, перадусім, па бацькавых, замест nationalité, што ў бальшыні эўрапейцаў азначае ўласна грамадзянства. Адпаведна, замест бадзёрага адказу — soviétique!, як мяне вучылі ў школе на ўроках францускае, беларусы, габрэі, татары, палякі, давалі свае адказы. Цікавым тут ёсьць няўхільнае зьмяншэньне адсотку нацыянальных меншыняў у сучаснай Беларусі. Бо прадстаўнікі іншых нетутэйшых этнасаў, якія акурат і атаясамлівалі сябе з soviétique ці, найчасьцей, з «русскими», і меней за ўсё думалі пра сутнасьць пятага пункту ў савецкай чырванаскурай кніжыцы, з той жа лёгкасьцю прымаюць новыя правілы гульні, становячыся «беларусамі»… Цяпер палітонім «грамадзянства РБ» становіцца вызначальным фактарам для бальшыні з нас. Тут нам шмат лягчэй, чым расейцам ці літоўцам, бо нацыянальныя меншыні ў нас не аўтахтонныя, нідзе не складаюць кампактнае бальшыні ды культурныя іх адрозьненьні ад нас былі амаль сьцёртыя за савецкім часам. А цяпер яны сьціраюцца яшчэ хутчэй. Беларуская нацыя становіцца ўсё больш гамагеннаю, маналітнаю, паводле звычак, стаўленьня да дзяржаўнасьці, да ўласна культуры, урэшце.

## Былыя аднаасобнікі сьцяной за калгасы

Азірнемся й убачым, што беларусы сёньняшнія ўжо даўно ня маюць тых перажываньняў, што яшчэ чвэрць стагодзьдзя таму вызначалі наш сацыяльна-культурны клімат. Калі раней у гарадах розьніца паміж гарадзкімі й новапрыбылым вяскоўцамі (якіх за вочы і ў вочы называлі «крэстамі») выклікала да жыцьця шматлікія псыхалягічныя канфлікты, то цяпер яна стала амаль незаўважнаю. Роўна, як незаўважнаю сталася розьніца паміж насельніцтвам заходніх і ўсходніх раёнаў. Бо за апошнія пару тузінаў гадоў адышло пакаленьне заходніх беларусаў, носьбітаў несавецкае працоўнае этыкі, сацыяльнае й рэлігійнае культуры. Зь іншага боку, прыхільнасьць да калгаснага ладу сёньня больш характэрная там, дзе былі й засталіся калгасы-мільянэры, то бок на Заходняй Беларусі. Разам з тым, і канфэсійная сытуацыя становіцца стабільнаю й больш-менш аднастайнаю на большай частцы Беларусі.

Гэтак складаецца, што цяперашняя беларуская нацыя мае мізэрны набор бясспрэчных традыцыяў і ня мае ранейшай карціны сьвету, шмат элемэнтаў нашае традыцыйнае культуры і рэгіянальных і субэтнічных адрозьненьняў размываецца — уніфікуюцца гаспадарчая дзейнасьць, жыльлё, ежа, сама культура. Паводзіны й матывацыі продкаў ужо не разглядаюцца як эталён, для беларусаў мадэльлю паводзінаў становяцца паводзіны іхных сучасьнікаў. Ня продкі, мітычныя й рэальныя, не дзяды-бабкі, нават не бацькі, а самі людзі вызначаюць адказы на сутнасныя пытаньні быцьця. І старэйшыя ўжо ня бачаць у жыцьці маладзейшых паўтору ўласнага жыцьцёвага досьведу.

Адна з прычынаў росту нацыянальнае самасьвядомасьці й пакутлівых пошукаў уласнае ідэнтычнасьці — пошук арыенціраў і стабільнасьці ў зьменлівым і перанасычаным інфармацыяй сьвеце. А зь іншага боку, беларусы апынуліся сам-насам з новымі міжнацыянальнымі кантактамі, што праз міграцыі, турызм, працу, становяцца ўсё больш важнымі. І, пэўна, яшчэ важней — рост у геамэтрычнай прагрэсіі масавых камунікацыяў. Перадусім, інтэрнэту. Несупынныя кантакты і праз яго гэтаксама актуалізуюць нашую новую ідэнтычнасьць, у штодзённым параўнаньні, праз якое можна яшчэ больш кантрасна вызначыць уласную нацыянальнасьць, як нешта выключнае й апрычонае.

## Парадаксальнае адраджэньне

Імклівы рост этнічнае ідэнтычнасьці беларусаў ад 1980-х гг. напачатку нават выглядаў парадоксам. Бо адбываўся паралельна з нарастаючай уніфікацыяй духоўнае й матэрыяльнае культуры ў СССР. Амаль паўсюдна ў Беларусі, напрадвесьні перабудовы, акрэсьлілася цікавасьць да «каранёў», да помнікаў даўніны, да фальклёру й нацыянальнае гісторыі. Рабіліся спробы рэанімаваць старасьвецкія абрады й сьвяты, нават увесьці ў *«абичапіт»* стравы нацыянальнае кухні. У прафэсійнай культуры выкшталтавалася цэлая *«фальклёрная»* плынь, пачаліся пошукі *«загадкавай душы народу»*. Шмат у чым таму спрыяла блізкасьць Балтыі й Украіны, дзе гэтыя працэсы былі яшчэ больш відавочнымі. Дыялектыка заключалася ў тым, што, памнажаючы культурны прадукт у нацыянальных формах, камуністычныя ўлады не адказалі на выклік часу пра «сацыялістычны зьмест». Нават усесаюзнае чэмпіёнства менскага (кіеўскага, тбіліскага) «Дынама» ўспрымалася як нацыянальны трыюмф. І гэтая колькасьць, нават эрзацнага й павярхоўнага, прадукту, урэшце, перарастала ў якасьць. Умацаваньне этнічнае ідэнтычнасьці й усьведамленьне сваёй выключнасьці.

Прытым, напрыканцы існаваньня СССР у беларусаў этнічная ідэнтыфікацыя была куды больш выразнай, чым, напрыклад, у расейцаў. Гэтак, згодна з вынікамі этна-сацыялягічных дасьледаваньняў, праведзеных у 1988 годзе, блізу 25% пашпартных расейцаў ня здолелі адказаць, на чым палягае іхная этнічная роднасьць, апроч *«пятае графы»* ў чырвоным пашпарце. Ня маю пэўнасьці, што сёньня сытуацыя істотна розьніцца, калі мець наўвеце этнічную еднасьць расейцаў, напрыклад, Латвіі, Казахстану й Сахаліна... Леташнія этнічныя закалоты ў Францыі альбо ў Бэльгіі сьведчаць, што падобныя праблемы нікуды ня дзенуцца ў агляднай пэрспэктыве. То бок пошукі ўласнае ідэнтычнасьці, уласнага «мы» для розных народаў — адна з самых актуальных праблемаў культуры й палітыкі. Відавочна, што ўсьведамленьне сваёй прыналежнасьці да пэўнага народу, пошукі яго асаблівасьцяў, маюць вялізарную значнасьць для стасункаў між людзьмі і паміж іхнымі групамі, але, перадусім, і для самаацэнкі чалавека.

Бясспрэчна, што важным чыньнікам росту нацыянальнае самасьвядомасьці ў 1980-я гады стала абвастрэньне ў гіерархіі СССР унутрыапаратных, унутрыпартыйных супярэчнасьцяў. Балазе, да таго часу этнічныя беларусы пачалі складаць абсалютную большасьць ва ўладных структурах БССР. Роўна, як і ў культуры й навуцы. Зрэшты, й адукацыю бальшыня адмыслоўцаў атрымлівала ўжо ў сваім краі. То бок на мяжы 1970—1980-х гадоў этнічна беларуская эліта запанавала тут, авалодаўшы спачатку адміністратыўнымі рэсурсамі, а затым і мэханізмамі ідэйных уплываў. На фоне абвастрэньня палітычнае й эканамічнае канкурэнцыі розных тэрытарыяльных утварэньняў у самой імпэрыі да жыцьця было пакліканае ўнутрыэтнічнае ўзаемадзеяньне, нягледзячы на нібы татальную ўніфікацыю матэрыяль-

нае й духовае культуры. Апатэозам нацыянальнага пачуцьця сталася бурапеннае сьвяткаваньне 100-годзьдзя народзінаў Янкі Купалы й Якуба Коласа, калі ў нас толькі сьляпы й глухі пра тое ня ведаў. Вялікія посьпехі на савецкай эстрадзе беларускіх выступоўцаў надавалі аптымізму ўсім беларусам, мацуючы тую, новую, нязнаную ідэнтычнасьць. Выцягнутыя з фальклёрных рэгіянальных крыніцаў песьні станавіліся агульнанацыянальнымі шлягерамі ў рок-н-рольнай аранжыроўцы… У застольнай аранжыроўцы.

## Выцесьнены Чарнобыль

І, вядома, Чарнобыль, які дзіўным чынам супаў з Тысячагодзьдзем хросту Русі й пачаткам рэлігійнае талеранцыі... За дваццаць з гакам гадоў, пасьля нечуванага ўсплёску моды на рэлігію, мы бачым, што беларусы па-ранейшаму ставяцца да пытаньняў веры ў лепшым выпадку «фальклёрна» (паводле вызначэньня мітрапаліта Смаленскага й Калінінградзкага Кірылы). Красамоўным прыкладам рэальнага стаўленьня да праваслаўнае традыцыі ў нашай краіне, што некаторыя ўпарта працягваюць называць «праваслаўнай» — бурапенныя калядныя сьвяты ад 25 сьнежня, з шалёным (у межах ўяўленьняў і адукацыі) застольлем у наваголнюю ноч і праглядам зусім няпосных тэлеперадачаў. Так, парафія маладзее. Але, збольшага, за кошт натуральнага сыходу старое парафіі. І колькасьць вернікаў застаецца стабільнай. Калі пералічыць колькасьць парафіянаў у суадносінах з бальшынёй народу, то іхны адсотак апынецца блізкім да статыстычнае памылкі. Адпаведна, за два дзясяткі гадоў мы ўжо можам пераканацца, што й «хрысьціянскія вартасьці» ня ёсьць чыньнікам нашае новае ідэнтычнасьці. Пагатоў, гэтага ня можа адбыцца й праз пярэсты канфэсійны склад.

Яшчэ большым парадоксам стала поўная індыфэрэнтнасьць да пытаньняў экалёгіі. Той магутны ўздым экалягічных рухаў, што быў ускалыхнуў беларускае грамадзтва пасьля Чарнобылю, сышоў на нішто. У пясок. У дадзеным выпадку я канстатую вельмі выразную прыкмету нашае ідэнтычнасьці: беларусы ў сваёй бальшыні людзі безадказныя й легкадумныя... Пасьля апакаліптычнае карціны ў чарнобыльскіх раёнах, намаляванай тутэйшымі й усесаюзнымі СМІ, СЫХОДУ не адбылося! Мала хто ня кінуўся зь дзецьмі на руках прэч з радыяцыйнага пекла! Нешта памітусіліся ўлады (!), кагосьці перамясьцілі, бальшыня павярталася і... канец. Гэтак жа, як і сёньня, большасьць хоча верыць, што ўсё ў парадку. І ў калячарнобыльскіх раёнах і пад Наваполацкам, Бабруйскам, Сьветлагорскам і г.д. І чарнобыльская трагедыя, адыграўшы вялізарную ролю ў справе кансалідацыі нацыі (на супрацьпастаўленьні «мы» (пацярпелыя беларусы) і «яны» (непацярпелыя савецкія народы)), насуперак усім сурокам і прагнозам, амаль цалкам выпалі з комплексу цяперашняе беларускае ідэнтычнасьці.

Але беларусы, тым ня меней, усё больш выразна дыфэрэнцыююць сябе сярод іншых. Бо беларускасьць, часам эфэмэрная ці ірацыянальная (калі вядзецца, напрыклад, пра дэмакратычныя каштоўнасьці ці свабоду рынку) усё ж выконвае свае важныя функцыі:

1) дазваляе арыентавацца ў навакольным сьвеце, даючы спарадкаваную (часам скажоную) інфармацыю;

2) перадвызначае агульныя, падставовыя вартасьці (прырода—чалавек—дзяржава, продкі—нашчадкі ды г.д.);

3) бароніць, адказваючы за сацыяльнае й псыхалягічнае самапачуцьцё *(«у нас — гэтак, а там — так», «нашы перамаглі»* ды г.д. ).

Значнасьць і роля прыкметаў ідэнтычнасьці ва ўспрыманьні людзей з тае ці іншае этнічнае супольнасьці мяняюцца ў залежнасьці ад канкрэтнай гістарычнай сытуацыі. Напрыклад, ад ступені кансалідацыі этнасу, ад ступені ягонае суб’ектнасьці, ад спэцыфікі этнічнага атачэньня. У савецкі час, напрыклад, нікому б у галаву не прыйшло «легалізаваць» трасянку й лузэрскую стылістыку. Спачатку гэта стала апраўданым прыёмам для сатырычных скетчаў «Сашы і Сірожы», а цяпер — магістральны кірунак афіцыйнае поп-культуры РБ.

Прыкметныя этнічныя дыфэрэнцыяцыі амаль заўжды адлюстроўваюць пэўную аб’ектыўную рэальнасьць, часьцей за ўсё элементы духоўнае культуры. Але гэтае адлюстраваньне можа быць адэкватным альбо не. А часьцяком і несапраўдным.

## Канец вёскі

Гэтак, у часы СССР добра зацьвікавалі ў савецкія галовы міт пра беларусаў-бульбаедаў, якія маюць па-над 1000 страваў з «другога хлеба». Але гледзячы на кардонкі з-пад піцаў, якімі пасьля апошніх сьвятаў засьмечаныя двары, я перакананы ў іншым. Цяпер беларусы ўжываюць традыцыйныя стравы паводле хатніх рэцэптаў толькі як выключэньне. Беларускімі стравамі сталі макарона, пельмені ды, для маладзёнаў, піцы. Нашыя кухары/гаспадыні ўсё часьцей аддаюць перавагу nouvelle cuisine. А як часта спажываюць, напрыклад, якую банальную колісь бабку з грыбамі ці шкваркамі, кожны з нас ведае сам.

Агульнасьць паходжаньня ўсіх адзінак этнасу — гэта таксама прыгожы міт; альбо з адной і той самай тэрыторыяй таксама могуць асацыяваць сябе некалькі народаў. Ня выкрасьліш, як ні хаці, напрыклад, польскасьці з Гарадзеншчыны альбо габрэйскай спадчыны з нашае гарадзкое культуры. А для беларускіх татараў Беларусь — адзіная радзіма. Са свайго досьведу ведаю багата людзей рознага паходжаньня, што сталіся беларускімі патрыётамі.

Разам з тым, бальшыня нашых традыцыйных элемэнтаў народнай пабытовай культуры за апошнія 30—40 гадоў зьнікла з рэчаіснасьці, перамясьціўшыся ў лепшым выпадку ў музэі. У непапулярныя, трэба зазначыць, музэі. Туды ж перамясьціць даўно пара і *«вёску»*, як зьяву, як вялізарны міт XIX — пачатку XX ст. Большасьць нашых паваенных, пасьлячарнобыльскіх, постсавецкіх вёсак пераўтварыліся ў *«аграгарадкі»* задоўга да таго, як гэтае слова знайшлося на языку сёньняшніх прапагандыстаў. Скрыні з сылікатнае цэглы й шыфэру, што выстаўленыя ўздоўж асфальтавае дарогі ад шашы да калгаснае фэрмы, з жалезным крыжам на павароце, звараным з стандартных трубаў — наша ўжо ня новая зьява. Ад Сапоцкіна да Лельчыцаў!

Што яшчэ засталося? Нацыянальная мова, страчаная большасьцю беларусаў, тым ня меней, па-ранейшаму, успрымаецца як сымбаль адзінства. Толькі як сымбаль… Для бальшыні яна ўжо нават і ня «матчына», а хіба «бабчына»… Тым ня меней, роля гэтага сымбалю для беларусаў калясальная! У 1999 годзе, паводле перапісу, 85,6% прызналі роднаю моваю толькі беларускую, а зь іх — 3 млн 683 тысячы сказалі, што нібы карыстаюцца ёю ў паўсядзённым жыцьці!..

То бок этнічная супольнасьць — гэта, перадусім, агульнасьць уяўленьняў пра нейкія прыкметы, а не сама па сабе рэчаісная культурная апрычонасьць. То бок можна вызначыць, што беларусы — гэта ўстойлівая ў сваім існаваньні група людзей, што склалася цягам апошніх двух з гакам дзесяцігодзьдзяў, якія ўсьведамляюць сябе яе складнікамі на падставе самых розных, часьцяком выпадковых (наяўнасьць калярытнага ПП РБ) прыкметаў, што ўспрымаюцца імі як этнавызначальныя. На Вадохрышча было ня ўбіцца ў цэрквы. А пасьля людзі з плястыкавымі бутэлькамі штурмавалі транспарт. Не было столькі людзей у храмах ані на апошні Вялікдзень, ані на Раство Хрыстовае. У гэтым і тоіцца сакрэт дзьвюхдушнага беларускага характару, забабоннасьці й стаўленьня да веры. Беларусы ў сваёй большасьці па-ранейшаму ня вераць у Бога, але хочуць атрымаць на халяву жывое гаючае вады. На ўсялякі выпадак.

# Новыя магчымасьці для новых патрэбаў

У беларускім нацыянальным характары пачалі адбывацца фундамэнтальныя зрухі. Піша **Андрэй Вардамацкі**.




СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ

**Галоўны пляц у Глыбокім (Віцебшчына).**

Зьмяняюцца часы — зьмяняюцца патрэбы людзей. Мы, сацыёлягі, спрабавалі зьмераць істотныя зьмены ў каштоўнасных арыентацыях беларускага грамадзтва.

Самым галоўным да гэтага часу зьяўлялася такая сытуацыя, калі беларускі чалавек меў сапраўды добрае эканамічнае самаадчуваньне. Яно не пагаршалася на працягу практычна ўсяго апошняга дзесяцігодзьдзя, за выняткам 2003 году. Але пры такім добрым — сярод усяго насельніцтва — эканамічным самаадчуваньні чаму ж тады адбыліся такія масавыя пратэсты ў 2006 годзе, чаму была Плошча сакавіка 2006 году?

Адкуль узяліся гэтыя людзі, што імі рухала? Што зьмянілася? Думаю, што трывіяльныя тлумачэньні пра заходні подкуп ужо ніхто не прымае сур’ёзна. Гэтыя тлумачэньні пра падкупленых Захадам маргіналах засталіся ў слаўных савецкіх пяцідзясятых і выцягнутыя з «машыны часу» з рухам назад. Насамрэч гэтымі людзьмі рухалі некаторыя абвостраныя і гранічна ўсьвядомленыя каштоўнасьці. І гэта былі зусім іншыя каштоўнасьці, зусім не матэрыяльна-кілбасных уласьцівасьцяў. Тут важна разумець, што, як правіла, сацыяльныя зьмены, народныя рухі-хваляваньні адбываюцца не таму, што эканамічная сытуацыя пагаршаецца аб’ектыўна, але таму што гэтая эканамічная сытуацыя пачынае ўспрымацца як горшая суб’ектыўна. (Дарэчы, адной з самых шчасьлівых нацыяў у сьвеце паводле свайго суб’ектыўнага самаадчуваньня зьяўляюцца кубінцы — зь іхнімі месячнымі даходамі памерам некалькі дзясяткаў даляраў ЗША.) Мы паспрабавалі зьмераць структуру каштоўнасных арыентацыяў гэтых людзей. Выявілася, што дамінуючай у іх сталася такая каштоўнасьць, як свабода.

Як вядома з тэорыі каштоўнасьцяў, найбольшую вагу, значнасьць заўсёды пачынае набіраць тая каштоўнасьць, магчымасьці рэалізацыя якой у дадзены момант абмежаваныя (scarcity theory).Так сталася з каштоўнасьцю «свабода».

Зрабіўшы гэтыя высновы, а на паўтары гады адышоў ад каштоўнасных вымярэньняў і вярнуўся да іх толькі ў самы апошні час. Выявілася, што адбыліся цікавыя зьмены. Цяпер тыя, у каго даміноўнай каштоўнасьцю зьяўляецца «свабода», другой сваёй базавай каштоўнасьцю маюць «новыя магчымасьці». Новыя магчымасьці і свабода — гэта ланцужкі адзінага неразрыўнага двупалярнага комплексу. Як сказалі б фізікі — біполя. Адна каштоўнасьць — свабода — абавязкова мае на мэце існаваньне другой — новыя магчымасьці. Рэалізацыя адной каштоўнасьці — новыя магчымасьці — немагчымая без рэалізацыі іншай каштоўнасьці — свабоды.

Ізноў спрацоўвае тэорыя недастатковасьці: каштоўнасьць, магчымасьцяў рэалізацыі якой няма, альбо яны становяцца меншымі, падымаецца ў гіерархіі каштоўнасьцяў. Тое, што раней адбылося з каштоўнасьцю «свабода», з той самай тэарэтычнай заканамернасьцю адбылося і з каштоўнасьцю «новыя магчымасьці». Зьмены палягалі ў тым, што пачаўся адыход ад традыцыйнай простай ідэалёгіі. «Чарка і скварка» ўвідавочкі стала губляць сваю прывабную моц і ўсё больш выглядаць як постваенны і постсавецкі анахранізм. У беларускім нацыянальным характары пачалі адбывацца фундамэнтальныя зрухі.

Беларуская талерантнасьць як базавая рыса нацыянальнага характару ў цяперашняй канкрэтна-гістарычнай сытуацыі набыла форму канфармізму — маўклівай цяр-

пімасьці да ўсяго, што адбываецца, пакоры. Трагічным вынікам шматлікай чарады спусташальных войнаў, якія прайшліся па Беларусі ў розныя часы, і асабліва апошняй, Другой усясьветнай, былі ня толькі забітыя людзі — але і забіты нацыянальны характар. Маленькая і вельмі пакорлівая краіна — вось значна больш адэкватная формула, чым тая, якая так часта выкарыстоўваецца ў афіцыйных рэляцыях і зваротах да «вельмі простага народу» альбо вонкавага сьвету, Захаду, што рамантычна не разумее сутнасьці таго, што адбываецца.

Можна назваць тры асноўныя прычыны такіх зьменаў і ўзвышэньня каштоўнасьці «новыя магчымасьці»:

1) Інфармацыя з вонкавага сьвету. Фізычна адчувальнае набліжэньне і абуральна-рэжучы вока прыклад Эўрасаюзу, які апынуўся аж у занадта непасрэднай блізкасьці, проста за суседнім кутом памежна-пешаходнага пераходу Каменны Лог.

2) Чарка і скварка, стабільнасьць сталі ўспрымацца не як дасягненьне, а як усё большае нарастаньне неразьвіцьця, нескарыстаньня іншых, больш шырокіх, магчымасьцяў, якія так відавочна сталі заўважныя ў іншых краінах.

3) Матэрыяльны рост, да якога імкнуўся беларускі істэблішмэнт, згуляў зь яго ініцыятарам кепскі і сапраўды злы жарт. Імкнучыся ўтрымаць рэйтынг на пэўнай вышыні ўсенароднай любові, прэзыдэнт імкнуўся падтрымліваць матэрыяльны дабрабыт насельніцтва. Але справа ў тым, што пры дасягненьні пэўнага ўзроўню матэрыяльнага дабрабыту ў любога чалавека адбываецца рэструктурызаваньне каштоўнасных арыентацыяў — на першы плян выходзяць іншыя, не зьвязаныя толькі з патрэбамі элемэнтарнага выжываньня, простага матэрыяльнага існаваньня, але ўзвышаючца патрэбы самарэалізацыі, адэкватнага інфармацыйнага забесьпячэньня і гэтак далей. А гэта менавіта тое, што ня можа даць наяўны статус кво. І тады чалавек уступае ў пэрыяд выхаду, пошуку новых магчымасьцяў.

Усё сказанае тут пра новыя магчымасьці і свабоду датычыла ў першую чаргу найбольш актыўных чальцоў беларускага грамадзтва. Але ў апошні час зьявілася новая сацыяльная рэальнасьць — як вынік знакамітага ўказу аб упарадкаваньні ільготаў. Указ, вымушана прыняты ў парушэньне ўсёй ідэалягічнай лініі сацыяльна арыентаванай дзяржавы праз узьніклыя эканамічныя цяжкасьці, нечакана выклікаў вялікія наступствы для істэблішмэнту. Зьявіўся новы пласт незадаволеных, назавём іх матэрыяльна апусканыя. І яны знаходзяцца ня толькі і ў першую чаргу ня столькі сярод актыўных, зь вялікім асабовых рэсурсам людзей, але і сярод традыцыйнага электарату цяперашняга істэблішмэнту. Новыя магчымасьці для іх — гэта простае падтрыманьне магчымасьцяў ранейшых. Да людзей, што чакаюць і шукаюць сапраўды новыя магчымасьці, далучыліся людзі, для якіх новыя магчымасьці — гэта магчымасьць утрымаць хаця б былыя старыя магчымасьці.

Новыя магчымасьці — гэта даволі розныя рэчы для розных сацыяльных групаў. Для студэнтаў — гэта новыя магчымасьці ў сэнсе свабоднага перасоўваньня ў родных навучальныя ўстановы за межамі, без узгадненьняў з дэканатам, неідэалягізаванае выкладаньне грамадзкіх навук, зьняцьце татальнага паліткантролю. Для прадпрымальнікаў — зразумелае празрыстае заканадаўства ў гліне бізнэс-актыўнасьці наагул і пададкаабкладаньня ў прыватнасьці. Для людзей навукі — пазбаўленьне ад нестасоўнай да сутнасьці грамадзкай дзейнасьці справаздачнасьці (прыкладам, пытаньня «колькі новых тэорыяў распрацавана?»). Для самых топавых эшалёнаў улады новыя магчымасьці — гэта магчымасьці нармальнага капіталістычнага ўкладаньня і росту назьбіранага капіталу, новыя палітычныя амбіцыі, прынамсі, гарантыі захаваньня капіталу. І гэтак далей.

Абмежаваны памерамі гэтага артыкулу, я не магу зрабіць тут падрабязны падгрупавы аналіз новых магчымасьцяў для кожнага сацыяльнага слою. Для краіны наагул новыя магчымасьці — гэта мадэрнізацыя эканомікі ўнутры і зьняцьце самаізаляцыі звонку. Самаізаляцыі ад Эўрапейскага Саюзу ў прыватнасьці і цывілізаванага сьвету наагул. З усімі вынікаючымі і накапляльна гублянымі эканамічнымі, культурнымі і палітычнымі перавагамі. Накапляльна — таму што краіну ўжо пачынаюць абыходзіць нафта- і газаносныя трубы, абыходзіць транспартныя аўтамабільныя плыні і гэтак далей — так вэктары сілавога поля агінаюць кропкі чужароднай прасторы.

Новыя магчымасьці — гэта тое, пра што цяпер думаюць людзі і будуць думаць яшчэ болей. Гэта новы істотны пласт у грамадзкай думцы, каштоўнасных арыентацыях людзей Беларусі. Ён будзе адыгрываць значную ролю ў электаральных паводзінах і той, хто гэта разумее, будзе мець добры электаральны патэнцыял.


зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




**Артур Клінаў. Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца.**
Раман




**Ева Вежнавец. Шлях дробнай сволачы.**
Апавяданьні




**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.**
Мэмуары

Замаўляйце кнігі сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» праз **(029)505-39-11, (029)126-36-87** або праз e-mail: **knihi@me.by**

# Добры позірк зь цемры



## Вялікі актор на малой сцэне

Ёсьць спэктаклі, на якія ходзяць ня дзеля рэжысэрскіх вынаходзтваў, ня дзеля таго, што гэта модная п'еса моднага драматурга. Ходзяць на актора. Піша **Аляксандар Фядута**.

18 лютага на малой сцэне Купалаўскага давалі «Беларусь у фантастычных апавяданьнях» — паводле «Шляхціца Завальні» Яна Баршчэўскага. Пяцьдзясят хвілін на сцэне быў народны артыст Генадзь Аўсяньнікаў. І хаця паэт сьцьвярджаў, што «лицом к лицу лица не увидать: большое видится на расстоянии», менавіта на малой сцэне, дзе няма магчымасьці схавацца за дэкарацыю, затуліцца ў цяні партнэраў — няма магчымасьці сфальшаваць, адным словам — менавіта тут і разумееш узровень акторскай ігры.

Невысокага росту сталы беларускі селянін (ня шляхціца, а селяніна грае Аўсяньнікаў) расказвае тры гісторыі-казкі — пра дабро, што мусіць перамагчы зло, і зло, якое не заўжды, на жаль, атрымліваецца перамагчы. Голас Івана Кірчука, што сьпявае працяглыя і нават крыху жаласныя песьні, суправаджае яго, запаўняючы пустую сцэну, дзе нічога няма — акрамя некалькіх мяхоў зерня, запаленых сьвечак, мужыцкай сьвіткі пад нагамі — і апавядальніка.

Вось ён стаіць перад намі, сьсівелы чалавек, што бачыў жыцьцё. Ён шчыра любіць сваіх герояў. Усіх. І паляўнічага Сямёна, што так бязглузда аддаўся нячыстай сіле за магчымасьць прыходзіць з паляваньня зь ягдташам, поўным дзічыны. І пана Скамароху, што адкрыў, падпарадкаваўшыся сваёй неўтаймаванай празе золата, шлях у гэты сьвет злой чараўніцы ў вобразе Белай Сарокі. І парубка Андрэя, які, дзякуючы сваёй дабрыні, здалеў вялікага Чараўніка.

Ён любіць іх. Каго трэба — шкадуе. Аўсяньнікаў грае такога агульнанацыянальнага бацьку — толькі ня злога, не суворага, а добрага, пра якога мараць хлопчыкі-байструкі ў якім-небудзь Аршанскім, Ганцавіцкім ці нават сталічным Шклоўскім раёне. Калі трэба павесяліць — і падскочыць, і станчыць, і сьпяе нешта вясёлае. Мараляў не чытае — так толькі, для прыліку, ссуне бровы і з сумам расказа чарговую казку, якой, імаверна, у глыбокім дзяцінстве — даўным-даўно! — ягоны ўласны бацька палохаў яго самога, але так, каб ня страшна было, а толькі павучальна.

У нашым дарослым жыцьці так мала дабрыні: людзі ў тралейбусах злыя, асабліва ўвечары; тэлевізар уключаць ня хочацца; спэцназ хапае хлопчыкаў інтэлігентнага выгляду, што, нібыта, матам лаюцца, і дзяўчат, што бароняць гонар сваёй хворай маці і арыштаванага бацькі. А тут, за два крокі ад той самай Плошчы, якую ранкам яшчэ атачалі аўтазакі, і людзі ў штацкім выцясьнялі зь яе журналістаў, што чакалі дробных прадпрымальнікаў, якія у большасьці так і не прыйшлі, — такая выспа цеплыні, пяшчоты, утульнасьці.

У гэтай усёпаглынальнай бацькоўскай дабрыні сакрэт аўсяньнікаўскага Апавядальніка. Я наагул не ўяўляю, ці здольны Аўсяньнікаў граць адмоўных пэрсанажаў, якога-небудзь злодзея ў трагедыі, скажам (ну, у лепшым выпадку, — Палёнія ў «Гамлеце», такога сабе клапатлівага татуся, які нават шпёніць за дачкой, што прывабіла прынца, гуляючыся, а не насамрэч). Але калі здольны, то дзякуй яму за тое, што пяцьдзясят хвілінаў гэтага спэктаклю на малой сцэне тэатру імя Янкі Купалы сталі часам бяз зла. Пра зло гавораць, але яно — ня страшнае, зьяўляецца, як у Гётэ ў «Фаўсьце», у выглядзе чорнага сабакі. Але стары так і не вымаўляе запаветных словаў, што дазволілі б д'яблу выйсьці на сьвет Божы, а таму сабака так і счэзьне, распусьціцца ў наступнай фантастычнай гісторыі, якую нанізвае — адну за другой — на нейкую тонкую, але дзіўна трывалую нітку, што зьвязвае яго з заляй гледачоў, гэты просты беларускі мужык. Які чамусьці лічыцца акторам.

Аўсяньнікаў ня грае. Ён жыве.

Калі ў апошнюю хвіліну вымеранага дакладна хранометрам спэктаклю ён нягучна ўздыхне, пасьля чаго, раздаўшы гледачкам зь першага шэрагу запаленыя сьвечкі, пачне чытаць услых малітву, якой яго навучыў бацька, мы ўжо проста не разумеем, пра чыйго бацьку ідзе гаворка — ці пра бацьку актора Генадзя Аўсяньнікава, ці пра бацьку Апавядальніка прыдуманых калісьці Янам Баршчэўскім гісторый. Гэта няважна. Проста калі б нас не пазбавілі выбару, то толькі бацьку, здольнага ТАК маліцца — за ўсіх! — мы бы і выбралі.

Цяпер — такога б выбралі…

А ТАДЫ? Тады, калі была рэальная магчымасьць, — чаму не такога выбралі?

Можа быць, таму што такога — не было? Таму што ўсе мы толькі марым пра дабрыню, але самі да дабрыні не імкнемся і дабрыні ня вучымся.

…Апошняя з гісторый, расказаных у гэты вечар Аўсяньнікавым, — спэцыяльна для ўсіх нас.

Злы Чараўнік адгарадзіў сваю краіну ад усяго астатняга, як бы мы сёньня сказалі, цывілізаванага сьвету. Толькі ня ён сам агароджу гэтую ўзводзіў. Лёкаі яму добраахвотна дапамаглі. І калі адчулі яны сілу дабрыні, то адвярнуліся ад свайго Чараўніка — і ўпала сьцяна, і скончылася зло, і птушкі пачалі сьпяваць у той зачараванай і не падобнай да іншых краіне.

І ці таму, што расказвае гэтую казку стары чалавек, што добра ведае жыцьцё, ці таму, што і тут ён нікога не сьпяшаецца асудзіць, расстраляць, арыштаваць, прызваць да адказу, — верыш! Верыш чамусьці, што вось гэтым разам зло абавязкова зазнае паразы.

Але людзям хочацца верыць у добрае. Асабліва ў тэатры.

…А артыст Генадзь Аўсяньнікаў выйшаў на паклон. Ягоныя вочы сьветла блішчэлі, і быў бачны ўзмакрэлы лоб: праца ёсьць праца, нічога не паробіш. І дзяўчынка з трэцяга (?) вынесла яму букет кветак.

І гэта было справядліва.

**Аляксандар Фядута, глядач**

# Час, дадзены, каб узрастаць



Асаблівасьці гэтай сям'і: яны шчырыя і дзейныя вернікі. Алена і Сяргей Панасевічы жывуць у Берасьці. Сяргей, які ў свой час скончыў радыётэхнічны, працуе загадчыкам цэху на прыватным прадпрыемстве. Алена, матэматык з адукацыі, займаецца зь дзецьмі (у сям'і тры хлопчыкі: Юрась, 9 год, Стась, 6 год ды Ігнась, 4 гады), раней была прадпрымальніцай. Сяргей адзін час быў старшынём рады ў берасьцейскай грэка-каталіцкай парафіі Сьв. братоў-апосталаў Пятра і Андрэя. Сяргей гаворыць па-беларуску; у сябе дома ён ладзіць сустрэчы зь цікавымі для кола іхных сяброў людзьмі. Пасьля апошняй такой сустрэчы — зь філёзафам-манахам Пётрам Рудкоўскім — я і напрасілася да іх у госьці, каб пагутарыць.

## Да Бога прывёў сын

**Наталка Бабіна: Скажыце, калі ласка, як адбыўся ваш прыход менавіта да ўніятаў?**

**Алена Панасевіч:** Я полька, была ахрышчаная ў касьцёле. Але ні я, ні Сяргей, калі бралі шлюб, не былі такімі ўжо актыўнымі вернікамі. Наша хрысьціянскае ўзрастаньне і наша сямейнае жыцьцё пачаліся адначасова.

**Сяргей Панасевіч:** Даволі доўга мы чакалі дзяцей, і калі нарадзіўся Юрка — гэта быў штуршок, пакліканьне да адказнасьці. Я магу сказаць, што да Бога мяне прывёў першынец. А чаму менавіта ўніяты? Ведаў пра гісторыю уніі. Для мяне вельмі важна, што сучасныя грэка-каталікі панесьлі крыж беларускасьці. І, нарэшце, менавіта ўніяцтва давала мне магчымасьць быць у адной царкве з жонкай. Я, праваслаўны паводле хросту, і яна, з рыма-каталікоў, знайшлі тут тое, што шукалі.

Калі нарадзіліся нашыя дзеці, выявілася, што, каб быць «дбайным бацькам і ахвярнай маці», мусім адмовіцца ад прыемнага баўленьня вольнага часу, абмяжоўваць уласныя інтарэсы і выдаткі, лічыць капейчыну. Трэба ўвесь час выбіраць паміж важным і найважнейшым. Выявілася, што мы з жонкай маем недахопы, якія нас раздражняюць і раняць. Я заўважыў за сабой, што зусім не гатовы да сьвядомага і радаснага служэньня блізкім, што крыўдую, а не дарую сваёй жонцы, што сам не магу разьвязаць сямейныя праблемы... Мы з жонкай пачалі закрываць свае душы адзін ад аднаго, не жадаючы раніць і захоўваючы прыстойны выгляд... Давялося прызнаць: я — слабы, бо «будаваў на пяску», бяз Бога! Менавіта ў той час, пяць гадоў таму, мы, з блаславеньнем параха, трапілі на тыднёвыя сужэнскія рэкалекцыі. «Так заклаў Ісус пачатак цудаў у Кане Галілейскай і зьявіў славу Сваю; і ўверавалі ў Яго вучні Ягоныя».

**АП:** Калі я выйшла з раддому, са зьдзіўленьнем даведалася, што муж рэгулярна ходзіць у грэка-каталіцкую царкву. Дарэчы, беларускасьць тады мяне абсалютна не цікавіла, была па-за полем майго зроку. Я пазыцыянавала сябе як полька з Гарадзеншчыны. Пачатак нашых сумесных крокаў у царкве паставіў перад намі шмат выклікаў: гэта і пытаньне больш глыбокага навяртаньня да Бога, і моўнае пытаньне, і пытаньне беларускасьці — і ўсё гэта ў досыць складаны для нашай сям'і час. Празь нейкі час мы далучыліся да стварэньня «Брацтва Каны», супольнасьці сужэнстваў, якія прагнуць працаваць для еднасьці асобы, сям'і, Царквы, грамадзтва і праходзяць сумесную фармацыю. Сустрэчы брацтва наведваюць, апроч каталікоў, і праваслаўныя, і пратэстанты, і няверуючыя. Але мы кантактуем як хрысьціянскія сем'і. Нашыя кантакты ў аснове сваёй маюць Хрыста.

**НБ: Раскажыце падрабязьней пра сваіх дзетак. Іх трое. Гэта быў сьвядомы выбар?**

**АП:** Першы сын быў літаральна доўгачаканы, таму, калі стала ясна, што хутка ў нас народзіцца другое дзіця, мы былі толькі радыя. Досыць нечакана для нас неўзабаве аказалася, што будзе і трэцяе. Дактары гаварылі, што мне трэба пачакаць з родамі, бо пасьля двух кесаравых

Працяг на старонцы 26.

# Час, дадзены, каб узрастаць

**Працяг са старонкі 25.**

сячэньняў прайшло занадта мала часу. Тым ня менш, ніякага ваганьня — нараджаць ці не нараджаць — у мяне не было.

**СП (сьмеючыся):** Мы займаемся «сынагадоўляй», але сьмела можна сказаць, што гэта ня мы выхоўваем дзяцей, а яны нас.

**НБ: Яны ў вас ходзяць у школу, дзіцячы садок?**

**АП:** Старэйшы, Юрка, ходзіць у трэцюю клясу. Калі яму прыйшла пара ісьці да школы, мы сталі шукаць у Берасьці беларускамоўную клясу. Такой не аказалася. І мы аддалі яго ў польскую.

**НБ: Ці задаволеныя вы школай, якасьцю навучаньня?**

**СП:** Так. У польскай клясе нам імпануе несавецкі адукацыйны падыход.

**АП:** Пані Эва Казімерчак, полька, якая працавала тут настаўніцай, вельмі многа працавала ня толькі зь дзецьмі, але і з бацькамі, ствараючы бацькоўскую супольнасьць, прывучаючы да салідарнасьці... Цяпер у нас іншая настаўніца, тутэйшая, але і яе прафэсійны ўзровень нас задавальняе.

**НБ: А ці цяжка вам, Алена, упраўляцца з трыма хлопчыкамі?**

**АП:** Няпроста. Цяпер большая частка майго часу ідзе на ўладкаваньне побыту, і гэта, прызнаюся, прыгнятае. Я працягваю займацца прадпрымальніцтам, але мінімальна: з аднаго боку, тут уплывае наяўнасьць маленькіх дзяцей, з другога боку — эканамічная сытуацыя ў краіне не спрыяе... Выжыць цяжка.

**НБ: А садкоў беларускіх у Берасьці таксама няма?**

**АП:** Няма. Стасік і Ігнат у нас дзьвюхмоўныя, і гэта заўважна. На ранішніках менавіта ім даюць беларускія вершыкі.

## Літаратурны салён

**НБ: Калі я патрапіла на вашыя сяброўскія сустрэчы, мяне моцна ўразіла, на якім эўрапейскім узроўні вы ўсё арганізавалі — пачынаючы ад пытаньняў, якія задавалі людзі, і заканчваючы цудоўным пачастункам. Адкуль у вас гэтая эўрапейскасьць, сьвецкасьць у лепшым значэньні слова?**

**СП:** Для мяне беларускасьць пачыналася з маёй бабулі, якая і цяпер жыве ў Мсьціславе. Там я ўпершыню пачуў натуральную беларускую мову, на якой людзі размаўлялі, як дыхалі. Тут я жыў у Камянцы, каля славутай вежы, у іншым моўным асяродку, тут мова мясцовая бліжэй да ўкраінскай. Наступны штуршок для мяне быў — Караткевіч, «Каласы пад сярпом тваім». Менавіта гэтая кніга прымусіла мяне задацца пытаньнем: вось я называюся беларусам, я беларус, але гэта ніяк не праяўляецца ў тым, як я жыву. Такая досыць шызафрэнічная сытуацыя, якая мяне прыгнятала. Спрабаваў размаўляць па-беларуску, адчуваючы сябе белай варонай. Гэта ня вельмі прыемна было. І вось у 2002 годзе, калі мы выехалі на сэсію «Каны» ў Варшаву, я назіраў за людзьмі іншых нацыянальнасьцяў, шчырымі хрысьціянамі, якім ня трэба было сябе дэманстраваць, і зразумеў, як гэта натуральна: быць тым, кім ты завесься. Гэта быў нейкі пункт пераломy. З таго часу я стаў размаўляць па-беларуску ня толькі зь дзецьмі, у сям'і, але і на працы, паўсюль — пры гэтым пазьбягаючы дэманстратыўнасьці, дзе гэта магчыма.

**НБ: А сучасная беларуская літаратура падаецца Вам цікавай?**

**СП:** Літаратура — спосаб інтэлектуальнага разьвіцьця. Для мяне няма бар'еру, па-беларуску кніжка ці па па-расейску. Беларускае — гэта, канечне, сваё. Але, напрыклад, самае цікавае з таго, што я чытаў апошнім часам, — гэта кніжка па-расейску Людмілы Ўліцкай «Даніэль Штайн, перакладчык». Дазволіць сабе асалоду паламаць галаву над ARCHE ці пачытаць цікавую кніжку я магу толькі ноччу, калі ўсе хлопцы нарэшце сьпяць...

**НБ: А кола вашых сяброў — хто яны?**

**СП:** Розныя людзі, зь якімі мы пазнаёміліся ў розных абставінах. Многа сярод іх вернікаў.

**НБ: А не бянтэжыць вас, што большасьць людзей навокал не жывуць ні верай, ні беларускасьцю?**

**АП:** Ня тое што бянтэжыць, палохае! Як з гэтым змагацца? Мы хочам узьдзейнічаць сваёй прысутнасьцю і пазыцыяй. Тое, што прапануем сваім знаёмым, — бацькам дзетак у садку, бацькам у школе, іншым людзям — простыя чалавечыя зносіны. Дзелімся тым, чым жывем. Гэтага хочацца нам самім, хочацца людзям. Гэтаму мы навучыліся ў хрысьціян.

**НБ: А ці вартыя гэтыя сустрэчы клопату?**

**СП:** Калі бачыш, што блішчаць вочы ў тых, хто прыходзіць, калі разумееш, што людзі пачулі нешта тое, чаго прагнулі — адчуваеш радасьць.

**АП:** Я жартую, называючы гэтыя сустрэчы літаратурным салёнам. Мне б вельмі хацелася, каб яны працягваліся. Я хацела б паслухаць Марыю Вайцяшонак, абмеркаваць традыцыі кулінарыі з Алесем Белым... Што да адкрытасьці, то яна вынікае з духоўнага жыцьця.

**СП:** Я спрабую цяпер глядзець на сваё жыцьцё як на час, дадзены мне Госпадам, каб я мог узрастаць. Часамі так глядзець цяжка. Але сказаць, што нашае жыцьцё аднастайнае і нецікавае, немагчыма.

## Пра беларускасьць Берасьця

**НБ: Берасьце — паводле сваёй сутнасьці, шматнацыянальны і шматканфэсійны горад. Ці заўважаеце вы гэта?**

**СП:** На жаль, не. Шматнацыянальнасьць і шматканфэсійнасьць — нейкія падпольная. Людзі выходзяць на вуліцу і робяцца, як усе. Што тыя ж украінцы сьвядомыя тут ёсьць, я магу здагадацца толькі па сьвежых кветках каля помніка Шаўчэнку, а больш ні па чым...

**НБ: Алена, ці ёсьць у Вас нейкая настальгія па Польшчы, жаданьне пераехаць туды?**

**АП:** Не, няма. Польскасьць у сям'і маіх бацькоў праяўлялася найбольш праз рэлігійныя традыцыі. Цяпер, хутчэй, я адчуваю сябе беларускай, грамадзянкай Беларусі.

## Пра будучыню дзяцей

**НБ: Як вы ўяўляеце будучыню сваіх дзяцей?**

**АП:** Цяпер у нас вялікія надзеі зьвязаныя з тым, што нашыя дзеці далучацца да хрысьціянскай супольнасьці, што мы будзем працягваць працу ў нашай царкве.

**СП:** Я вельмі доўга спадзяваўся, што змагу «ўсё пасьпець» у выхаваньні сваіх сыноў. Але цяпер я зразумеў, што я нічога ня здольны даць ім сам. З гэтага моманту спадзяюся толькі на Провід Божы...

**НБ: Чаму Вы гаворыце, што нічога ня зможаце даць? Вы працуеце, у Вас цудоўная кватэра, якая ў любым выпадку застанецца дзецям... Гэта ж нямала.**

**СП:** Я кажу ня столькі пра матэрыяльнае, колькі пра ўвагу, нейкія дадатковыя магчымасьці для разьвіцьця, нейкія свае ўменьні, якія хацеў бы перадаць. Жыцьцё аказваецца зусім не такім, як ты яго ўяўляеш, плянуеш. Таму я гавару, што будучыня залежыць толькі ад Бога.

**Гутарыла Наталка Бабіна**

# 3214









Фота–карэспандэнтка «НН» **Юлія Дарашкевіч** назірала за паказальным выступам брыгады спэцназу Ўнутраных войскаў МУС. У часьці 3214 маладыя байцы прымалі прысягу.

# Краіна Прыгранічная Зона

Піша **Зьміцер Лупач.**

У дзіўнай краіне мы жывем. Вось, напрыклад, захачу я паехаць ва Ўкраіну або ў Расею. Для гэтага дастаткова мець пашпарт і грошы, каб набыць квіток. Калі ехаць на цягніку ў тую ж Расею, вас ня спыняць нават на мяжы, і можна ехаць хоць за Ўрал. Але паспрабуйце ўехаць без адпаведных дакумэнтаў на прыгранічную тэрыторыю. Вам нават квітка ў касе не прададуць. Я працую ў так званай прыгранічнай зоне. Каб атрымаць дазвол на ўезд, мне давялося заплаціць 5,5 тысяч рублёў і чакаць тры тыдні. Прычым выдае такі пропуск асабіста начальнік пашпартнага стала. Якое было маё зьдзіўленьне, калі мне выдалі пропуск на СССРаўскім блянку. Прайшло ж ужо больш за пятнаццаць гадоў, як мы зьяўляемся незалежнай краінай.

Выходзіць, што паехаць за мяжу прасьцей, чым перасоўвацца па сваёй краіне.

## Пяцісотгадовы калгас

Пры ўезьдзе на тэрыторыю сельгаскаапэратыву «Верхняе» стаіць знак з датай «1514». Да нядаўняга часу гэта быў калгас імя Чапаева. Але ўтвораны ён быў не ў 1514 г., а ў 1949. Вёска Верхняе сапраўды ўзгадваецца ў 1514 годзе, але ж гэта шыльда ня вёскі, а СВК. Раней на такіх шыльдах ставілі зоркі або серп з молатам, цяпер — крыж. Мода…

## Сваё—чужое

У вёсцы Асінгарадок Пастаўскага раёну стаіць каплічка-помнік жаўнерам Пятра І, якіх пабілі швэды ў часе Паўночнай вайны. Паставілі яго некалькі гадоў таму. Канечне, вайсковыя магілы трэба даглядаць, але гэты помнік воінам іншай дзяржавы, якая вяла вайсковыя дзеяньні на тэрыторыі тады незалежнай Рэчы Паспалітай. І




хоць расейскі цар Пётар і польскі кароль тады лічыліся саюзьнікамі, паводзілі сябе царскія войскі далёка не як саюзьнікі. У выніку Паўночнай вайны, якая амаль дзесяцігодзьдзе праходзіла па нашай тэрыторыі і вялася за чужыя інтарэсы, Беларусь страціла трацціну жыхароў, была ўзарваная полацкая Сафія. Што маглі рабіць тут «защитники веры православной», калі ў Беларусі тады было 80% уніятаў? І чаму мы так ушаноўваем памяць пра чужых воінаў, а пра сваіх стараемся ў лепшым выпадку не памятаць?

Ужо каторы раз разбураюцца крыжы, што стаяць у памяць слуцкіх паўстанцаў, нішчацца крыжы ў Курапатах, няма помніка землякам, што загінулі ад немцаў пры абароне Кобрына ў верасьні 1939-га. Сьпіс можна доўжыць. Шмат хто зь беларусаў наогул ня ведае, што пры Пятру мы не ўваходзілі ў склад Расеі. На жаль, наша дзяржава пакуль нічога ня робіць, каб захаваць памяць пра беларусаў, што аддалі сваё жыцьцё за родны край.

## «Ім можна красьці, а нам — не»

У сельгаспрадпрыемствах сталі фарбаваць дызэльнае паліва і бэнзін Н-80. Робіцца гэта для таго, каб спыніць крадзяжы паліва, якія набылі значныя памеры ў сельгаспрадпрыемствах. Са словаў аднаго з кіроўцаў бэнзавозу, на тры тоны паліва дадаецца каля 40 г фарбы, якая бясшкодная для рухавіка, але па выхлапных газах дазваляе вызначыць, крадзенае паліва ці не. Ужо зьявіліся і першыя пацярпелыя, якія заплацілі немалыя штрафы за тое, што ехалі на фарбаваным паліве.

Мясцовыя «хімікі» спрабавалі зьняць афарбоўку, дадавалі ў паліва і ёд, і марганцоўку і іншыя хімікаты, але пакуль безвынікова. Фарба аказалася вельмі трывушчай.

Цяпер гаспадаркі мала выкарыстоўваюць паліва, асноўны яго расход чакаецца вясной, калі пачнуцца палявыя работы. Тады ж у мінулыя гады рэзка ўзрасталі аб'ёмы крадзяжоў. Раней, каб зарабіць у вяскоўца на бутэльку гарэлкі, трактарысту даводзілася араць «соткі», рызыкуючы пры гэтым патрапіць на вочы начальству. У апошнія ж гады дастаткова было, ні чым не рызыкуючы, прадаць вядро саляркі. На гэтую ж вясну сярод вяскоўцаў ходзяць чуткі, што міліцыянты будуць езьдзіць па вёсках і правяраць, чым запраўленыя прыватныя трактары, што працуюць на ўласных падворках. Гэта вельмі непакоіць вяскоўцаў, бо амаль ніхто на запраўках салярку не купляе.

Найбольш абурае вяскоўцаў тое, што на гарадзкіх прадпрыемствах паліва не фарбуюць. «Трэба пісаць скаргу, а то чаму ім можна красьці, а нам — не», — гаварыў мне знаёмы трактарыст. Тут ужо сапраўды па-беларуску: калі здохла ў мяне карова, то няхай і ў суседа здохне.

## Што ня так?

Рэклямны шчыт «Запчасткі да айчынных аўтамабіляў — ВАЗ, Масквіч, Волга» сустракае вас пры ўезьдзе ў горад Глыбокае. Я апытаў каля двух дзясяткаў чалавек на прадмет таго, ці бачаць яны штосьці дзіўнае ў гэтым шчыце, і толькі двое заўважылі, што расейскія аўтамабілі такія ж замежныя, як і нямецкія або японскія. Выходзіць, шмат хто яшчэ падсьвядома працягвае жыць у СССР.

Наша мясцовасьць да 1939 году ўваходзіла ў склад Польшчы. За няпоўныя два дзесяцігодзьдзі польская дзяржава змагла зрабіць палякамі значную колькасьць нашых грамадзян, якія пасьля засялілі так званыя новыя польскія землі на захадзе. Наша ж незалежная беларуская дзяржава амаль за такі ж час не зрабіла беларусаў сапраўднымі беларусамі, наадварот, з нас спрабуюць зрабіць нейкіх «бульбашоў». Але ж хочацца спадзявацца, што час усё расставіць на свае месцы.

*Глыбокае*

Беларускі самалёт разьбіўся ў Ерэванскім аэрапорце 14 лютага ў 2.19 па менскім часе. На шчасьце абышлося без ахвяраў.



# Першая катастрофа «Белавія»

## 6 сэкундаў ад узьлёту да падзеньня

14 лютага ў 2:19 па менскім часе самалёт кампаніі «Белавія» CRJ-100-M рэйсу B2-1834 падчас узьлёту сышоў з паласы, перакуліўся некалькі разоў і загарэўся. У выніку самалёт раскалоўся на дзьве часткі. Як высьветліцца потым, з моманту ўзьлёту да падзеньня прайшло 6 сэкундаў. Служба ратаваньня, пажарная служба і хуткая дапамога аэрапорту зрэагавалі імгненна. «Дзякуючы іх умелым дзеяньням усе 18 пасажыраў, а таксама 3 члены экіпажу былі вынесеныя з агню», — паведаміў начальнік Галоўнай управы грамадзкай авіяцыі Армэніі Арцём Маўсісян.

## Прычыны катастрофы высьвятляюцца.

Паколькі армянскія спэцыялісты недастаткова знаёмыя з дадзенай маркай самалёта, на дапамогу ў расшыфроўцы «чорных скрыняў» будуць пакліканыя канадзкія і беларускія адмыслоўцы. Была праведзеная папярэдняя мэдэкспэртыза членаў экіпажу. Яна ня выявіла ў крыві пілётаў алькаголю.

У Ерэван для ўдзелу ў расьсьледаваньні прычынаў аварыі накіраваліся спэцыялісты Мінтранспарту, дэпартамэнту грамадзянскай авіяцыі і авіякампаніі «Белавія». Беларуская транспартная пракуратура распачала па факце авіякатастрофы ў Ерэване крымінальную справу паводле ч. 1 арт.314 КК РБ («Парушэньне правілаў бясьпекі руху або эксплюатацыі чыгуначнага, паветранага або воднага транспарту»).

## Пасажыраў выратаваў выпадковы спадарожнік

Рэйсам B2-1834 ляцелі грамадзяне Армэніі, Беларусі, Грузіі, Расеі і Украіны. Экіпаж цалкам складаўся зь беларусаў — камандзіра экіпажу Віктара Шышло, другога пілёта Аляксандра Мухіна і бортправадніцы Вольгі Дрозд. У бальніцы з раненьнямі рознай ступені цяжкасьці патрапілі адзінаццаць чалавек, шэсьць зь якіх у той жа дзень былі выпісаныя. Паводле словаў грамадзянкі Беларусі Салві Амбарцумян, з палаючага самалёта ім дапамог выбрацца грузін Цэванян Сасун, які здолеў адчыніць люк зь сярэдзіны салёну. Ён патрапіў на гэты рэйс выпадкова.

## Няшчасьце магло здарыцца раней

21 студзеня ў самалёце «Белавія» на рэйсе Бэрлін—Менск амаль адразу пасьля ўзьлёту быў зафіксаваны сыгнал пра разгермэтызацыю салёну. На борце тады знаходзілася 27 пасажыраў.

Лётчыкі прынялі рашэньне зьнізіцца з 10 тыс. да 3 тыс. мэтраў. Самалёт пасьпяхова прызямліўся ў Менску, было заяўлена, што трывога аказалася непраўдзівай — дала збой аўтаматыка.

Самалёт CRJ-100-M быў пабудаваны ў 1999 годзе канадзкай фірмай «Бамбард'е», яго рухавікі былі выробленыя ў ЗША. Дырэктар НАК «Белавія» Анатоль Гусараў паведаміў, што апошняе тэхнічнае абслугоўваньне самалёта было праведзенае ў Даніі. У парку кампаніі такіх самалётаў да аварыі было два. Абодва былі набытыя летась на правах лізінга ў Нямеччыне.

Катастрофа ў Ерэване не паўплывала на пляны «Белавія» адносна набыцьця самалётаў CRJ, паведаміў намесьнік генэральнага дырэктара кампаніі Ігар Мікалаевіч Чаргінец. Ён казаў, што ня спыніць палётаў і другі самалёт гэтай маркі.

Катастрофа ў Ерэване і інцыдэнт у менскім аэрапорце не паўплывалі на пляны «Белавія» адносна набыцьця самалётаў CRJ. «Каля 1200 такіх самалётаў лётае ў сьвеце, і ніхто не адмаўляецца ад іх эксплюатацыі», паведамілі ў авіякампаніі.

**Сямён Печанко**

### У Менску не узьляцеў такі ж самалёт, які разьбіўся ў Армэніі

Другі куплены «Белавія» канадзкі самалёт CRJ–100, як стала вядома, з дзьвюх спробаў не ўзьляцеў у менскім аэрапорце. Праз кампутарны збой не спрацавалі закрылкі. У выніку 37 пасажыраў адправілі ў Маскву на Ту–154.

Рэйсы на Прагу і Бэрлін, якія мусілі ажыцьцяўляцца гэтым самалётам, наагул былі адмененыя. Бо ў Эўропу Ту–154 не пускаюць праз высокі ўзровень шуму. Пасажыраў адправілі праз Варшаву і Кіеў.

Пасьля рамонту самалёт аднавіў палёты.

Прадаецца

дзейная
жывёлагадоўчая
фэрма

да 2500 галоў сьвіньняў адначасовай пастаноўкі

Магчымае здаваньне ў арэнду

Разгледзім іншыя прапановы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва

Тэл.: 8 017 220 59 45

# Энцыкляпэдыя Капітана Танакі




http://www.tanakaland.org

12 сакавіка Менск
19.00 R-Club
# N.R.M.
·разьвітальны канцэрт·
р а з ь в і т в а е м с я з ь з і м о й
вул. Сурганава, 26

## ІМПРЭЗА

**Моладзь віншуе Барадуліна**

Шаноўнае спадарства! Запрашаем Вас на літаратурна-музычную акцыю **«Моладзь віншуе Барадуліна»**, якая адбудзецца **24 лютага (нядзеля), у дзень нараджэньня паэта, у фальварку «Добрыя мыслі» (Магілёўская, 12)**. У вечарыне возьмуць удзел: пісьменьніца і крытык Аксана Бязьлепкіна, а таксама **маладыя паэты** Валерыя Кустава, Глеб Лабадзенка, Рагнед Малахоўскі, Юля Новік, Андрэй Сузінь, Віка Трэнас, Віктар Ыванoў. **Маладыя барды** Андрэй Бананаў, Андрэй Касьцень, Павал Кузіч, Ганна Урбан, Раман Яраш. **Пачатак у 19.00.** Квіткі 6 тысяч. Чакаем Вас!

## РЭФЭРАТ

**21 лютага ў клюбе каталіцкай інтэлігенцыі імя сьв. Кірылы Тураўскага (вул.Арджанікідзэ, 6, ст.м.Аўтазаводзкая)** — рэфэрат А.Сідарэвіча «Збаўленьне і вызваленьне: рэлігія і сацыялізм». **Пачатак у 18.30.**

## ВЫСТАВА

**«Рыцары Вялікага Княства» ў Менску**

**У Музэі гісторыі і культуры (вул.Маркса,12)** ідзе выстава «Рыцары Вялікага Княства». У экспазыцыі — дасьпехі, халодная і агнястрэльная зброя, прадметы побыту продкаў. Усе атрыбуты адноўленыя майстрамі з рыцарскага клюбу «Княжы Гуф». Падчас рэканструкцыі яны абапіраліся на гістарычныя матэрыялы, гравюры, летапісы.

## КАНЦЭРТЫ

**Дзень народзінаў Кабэйна**

**22 лютага ў клюбе «Рэактар»** — дзень народзінаў Курта Кабэйна. Трыбʼют NIRVANA. Удзел: Partyzone, s.d.m., «Літвінтроль», «Мутнае вока», «Унія». **Пачатак а 18-й.** Квіткі: 12000—20000. Т.: (017) 288-61-60.




**Вясновая акцыя IQ48 і Zet**

**24 лютага ў «Гудвіне»** гурты IQ48 і Zet запрашаюць на вялікую вясновую Friends' Party. Усіх сяброў чакае неверагодны сюрпрыз! **Пачатак а 19-й.** Т.: (029) 689-40-48.

## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

**Янкі**

**21 лютага ў залі Саюзу кампазытараў (Плошча Свабоды, 5)** будзе прэзэнтацыя **кнігі Максіма Клімковіча і Уладзіслава Ахроменкі «Янкі, альбо Астатні наезд на Літве»**. Бяруць удзел: акторы Віктар Манаеў, Юрась Жыгамонт, пісьменьнікі Андрэй Хадановіч, Уладзімер Арлоў, Віктар Жыбуль, Джэці, музыкі Яраш Малішэўскі, Зьміцер Сідаровіч, кампазытар Ганна Кароткіна. **Пачатак а 18.00.** Уваход вольны.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

## «4 месяцы, 3 тыдні, 2 дні»

Румынія, 1987 — Беларусь, 2008.

**4 месяцы, 3 тыдні, 2 дні** (4 luni, 3 saptamani si 2 zile)

Румынія, 2007, каляровы, 113 хв.

**Рэжысэр:** Крыстыян Мунджу

**Жанр:** Псыхалягічная драма

**Прызы, фэсты:** «Залатая галіна» Канскага кінафэсту, прыз «Фіпрэсі», намінацыя на прэмію «Сэзар»... усяго 14 узнагародаў і 10 намінацыяў

**Адзнака:** 9 (з 10)

Румынія, 1987 год. «Залаты век» дыктатара Чаўшэску хіліцца да непазьбежнага скону. Гераіня стужкі Адылія (Анамарыя Марынка) спрабуе дапамагчы ўнівэрсытэцкай сяброўцы Габіце (Лаўра Васіліў) зрабіць падпольны аборт…

За колькі апошніх гадоў румынскі кінэматограф нечакана вырваўся наперад і стаўся адным з усясьветных лідэраў. У краіну прыйшлі заходнія кампаніі, рэжысэры набіраліся досьведу — і адбыўся сапраўдны кінавыбух.

Суворая псыхалягічная драма Крыстыяна Мунджу — не падобная ні на што. Прыватная гісторыя, пабытовыя падрабязнасьці, знаёмыя людзям савецкім — і сёньняшнім беларусам: дэфіцыт, нахабныя адміністратаркі, разьмеркаваньне ў вёску, чэргі, галеча — і спажывецтва як мара.

Дакоры старэйшых моладзі, якая «зажралася» і ня прагне стабільнасьці, шэрыя дамы й шэрыя вуліцы.

Але фільм далёкі ад перабудовачнае чарнухі і эстэцкага дакумэнталізму «Догмы»; кадры стрыманыя, максымальна тактоўныя — і напятыя, як спружына.

Рэжысэра цікавіць духоўны стан: твары, а ня рэчы; сумленьне, пачуцьцё — і несвабода. Прадуманыя, шурпатыя доўгія пляны, калі разгортваюцца эмоцыі, задушлівая атмасфэра, адсутнае неба над галавой. І стан трымценьніка, калі гераіня спрабуе пазбавіцца ад няшчасных парэшткаў.

Скаланаецца ад пакутаў твар Адыліі (выбітная акторка Анамарыя Марынка); цынізм хаваецца пад маскаю інфантыльнасьці (сяброўка Габіта й каханак Адыліі); крышыцца й ламаецца жыцьцё.

На пачатку карціны дзьве рыбкі безнадзейна хапалі паветра ў акварыюме, у фінале стужкі дзьве адчужаныя сяброўкі сядзяць у рэстарацыі пасьля цяжкіх і балючых грахоў — а побач пʼе і радуецца вясельле.

Крыстыян Мунджу не плякатыст — ён сьведчыць пра жыцьцё праўдзіва і востра. Але гэтае зьнявечанае й спакутаванае жыцьцё ёсьць сапраўдным кіно, бо прасякнутае аўтарскай любоўю і спачуваньнем.

**Андрэй Расінскі**

**Фэстываль кіно «Падарожжа Бэргмана на ўсход»**

Аддзяленьне Пасольства Швэцыі ў Менску пры падтрымцы Швэдзкага Інстытуту прапануюць фэстываль-рэтраспэтыву швэдзкага рэжысэра Інгмара Бэргмана «Падарожжа Бэргмана на ўсход» у Менску (кінатэатар «Перамога»).

Фільмы дэманструюцца на мове арыгіналу зь перакладам на беларускую мову. Сэансы безь перакладу адбудуцца толькі **ў Менску з 25 па 29 лютага а 17-й.**

**20 лютага, 19.00 — «Лета з Монікай»** (1953), 97 хвілін.

**21 лютага, 19.00 — «Мары»** (1955), 86 хвілін.

**22 лютага, 19.00** — «На краі жыцьця» (1955), 85 хвілін. Пачатак а 19-й.

**23 лютага, 19.00** — «Нічога ня кажучы пра жанчын» (1964), 80 хвілін.

**24 лютага, 19.00** — «Шэпт і крыкі» (1973), 91 хвілін.

**25 лютага, 19.00** — «Восеньская саната» (1978), 93 хвіліны.

**26 лютага, 10.00** — «Фані і Аляксандар», (1982), 188 хвілін. **Пачатак а 19-й.**

# пра-бел/ пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі





**Наша новая ідэнтычнасьць**
Сяргей Харэўскі: Апошняя чвэрць стагодзьдзя зьмяніла беларусаў амаль непазнавальна ..... 19

**Новыя магчымасьці для новых патрэбаў**
Андрэй Вардамацкі: У беларускім нацыянальным характары пачалі адбывацца фундамэнтальныя зрухі ..... 22

**Добры позірк зь цемры**
Аляксандар Фядута — пра спэктакаль «Беларусь у фантастычных апавяданьнях» ..... 24

**Час, дадзены, каб узрастаць**
Зь сям'ёй Панасевічаў гутарыць Наталка Бабіна ..... 25

**3214**
Юлія Дарашкевіч назірала за паказальным выступам брыгады спэцназу Ўнутраных войскаў МУС ..... 27

**Краіна Прыгранічная Зона**
Назіраньні Зьмітра Лупача ..... 28


## КАЛІ Б...

**...рэалізаваўся плян ператварэньня «Беларусьфільму» ў студыю, якая не саступае Галівуду.**



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

— Калега, я магу, канечне, памыляцца, але, наколькі я памятаю, бацька Мінай ня ўмеў лётаць...

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Шчыра спагадаючы беларускай нацыянальнай справе, вучні-беларусы Глухоўскага вучыцельскага інстытуту (Чарнігаўскай губ.), злучыліся ў «Беларускую Нацыянальную Хэўру». Мэты хэўры: самаадукацыя ў беларускім духу і шырэньне ідэі аб нацыяналізацыі беларускай школы (каб у нашых школах вучылі дзяцей па-беларуску). Каб дайсьці гэтага, хэўра 1) будзе падтрымліваць агульнабеларускі рух за нацыяналізацыю школы; 2) завядзе беларускую бібліятэку; 3) будзе ладзіць чытаньні, лекцыі, рэфэраты пра нацыянальную беларускую справу, пра нацыяналізацыю школы і пра розныя пытаньні беларусаведаньня. Каб былі патрэбныя на ўсё гэта грошы, кожны сябрук, прылучаючыся да хэўры, павінен адразу даць у касу 50 кап. і плаціць штомесячную складку па 15 кап.; за гэтыя грошы выпісваюцца беларускія кніжкі, а таксама і іншыя, каторыя датыкаюць Беларусі. Яшчэ, каб узбагаціць касу, хэўра мае арганізаваць тэатры, балі і да т.п.

**«Наша Ніва», №7, 1908**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Вацлаву П. з tut.by.** Няма як друкаваць у газэце асобным артыкулам тое, што можна прачытаць у энцыкляпэдыях і даведніках.

**Міколу Б. з Малой Беліцы.** Такіх лістоў, як Ваш, мы раней ня бачылі.

**Аляксандру С. з Горадні.** Дзякуй за рэдкі фатаздымак!

**Сяргею Н. з rambler.ru.** Аляксандар Казулін сёньня выклікае павагу сваёй мужнасьцю і бескампраміснасьцю. Факты, пра якія Вы згадваеце, тут нічога не зьмяняюць.





# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншую** спадара Алеся Туровіча, паэта і проста добрага беларускага хлопца з нагоды 35-годзьдзя ды 20-годзьдзя творчай дзейнасьці. Посьпехаў! Міхась

### ПРАЦА

**Праца для студэнтаў** у вольны ад заняткаў час. Т.: (029) 615-47-76

### КНІГІ, МАРКІ, ЗНАЧКІ, ВІДЭА

**Цітоў «Геральдыка Беларусі»**, Чэкалаў «З гісторыі шляхты ў Беларусі і суседніх дзяржавах», Залівака «Генэалёгія Беларусі...». Камплект значкаў «Гарады Беларусі» (зацьверджаныя Магдэбурскім правам), маркі з гістарычнай сымболікай, відэазапісы рыцарскіх фэстаў. Таксама шукаю кнігі па беларусістыцы, гісторыі. Т.: (029) 753-91-96, alesknigi@mail.ru, Менск 220030 а/с 195 (Алесю)

### СПАЧУВАНЬНІ

**Шчыра спачуваем** Зьмітру Вінаградаву з нагоды сьмерці маці. Сябры, калегі

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** 24 лютага (нядзеля) па маршруце: Менск—Белагруда—Вавёрка—Тарнава—Крупава—Дзікушкі—Малое Мажэйкава—Мураванка—Бердаўка—Менск. 14—17 сакавіка — «Падольскія Фартэцыі»: Камянец-Падольскі—Хоцін—Меджыбож. Т.: 292-54-58; (029) 622-57-20; (029) 509-12-16; (029) 110-19-28


# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.


12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 20.02.2008.

Замова № 970.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.